Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 ЛІПЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 124 (28234) Кошт 40 капеек

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Праца працягваецца

Учора завяршылася вясновая сесія беларускага парламента пятага склікання — апошняя перад выбарамі. Гэта не значыць, што праца абедзвюх палат прыпынена да фарміравання новага складу. У летні час працягнуцца не толькі сустрэчы з выбаршчыкамі, выкананне абавязацельстваў перад імі, падрыхтоўка законапраектаў на восеньскую сесію, у тым ліку — па фарміраванні новага бюджэту, але і распачнецца праца па заканадаўчым забеспячэнні рэалізацыі рашэнняў пятага Усебеларускага народнага сходу. На гэтым зрабілі асноўны акцэнт у сваіх выніковых выступленнях спікеры Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. СТАР. 3




### Першыя крокі «тэлезорак»

СТАР. 5



### Бітва за «ўласныя метры»

СТАР. 13



### Праграма тэлебачання на тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.07.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 2,01 |
| Еўра | 2,22 |
| Рас. руб. | 0,03 |
| Укр. грыўня | 0,08 |

ISSN 1990 - 763X

# Дарога з чарнічнага лесу



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхаркі вёскі Заеліца Глускага раёна вяртаюцца з лесу з поўнымі вёдрамі спелых ягад.

■ Мінус чатыры нулі

# І АТРЫМАЎ РУБЕЛЬ ПРЫЕМНУЮ ВАГУ

## Эканамічнымі агентамі найбольш пазітыўна ўспрымаецца тая грашовая адзінка, дзе прысутнічае найменшая колькасць нулёў

**Гэта я вам ад спецыялістаў Нацбанка сучасную фінансавую палітыку краіны даводжу. Не будзе ў нас больш мільянераў, у новым фармаце — дакладна. Вось і мінула 8 месяцаў пасля падпісання кіраўніком дзяржавы летась 4 лістапада Указа №450, дзе гаварылася аб дэнамінацыі. Такім чынам, замест банкнотаў узору 2000 года з сённяшняга дня мы пачынаем атрымліваць купюры ўзору 2009 года ў суадносінах 10 тысяч «старых» да 1 рубля новага.**

### УСЯКІ ГРОШ ХАРОШ

Няма ніякай відавочнай неабходнасці ў тым, каб у першыя гадзіны, дні ці нават тыдні пасля дэнамінацыі бегчы ў банкі ды абменьваць там старыя грошы на новыя. З пункту гледжання пакупніцкай здольнасці ў гэтым няма ніякага сэнсу. Можа хіба ён ёсць крыху ў тым, каб памацаць гэтыя новыя купюры, парадавацца вока прыгожымі фарбамі і цікавымі сюжэтамі, патрымаць у руках манеты. Прыемна адчуваць сябе гаспадаром каштоўных папер новага ўзору. Гэтае жаданне ў першую чаргу датычыць моцнага полу, бо мы і да пенсіі застаёмся дарослымі дзеткамі. А тут такая сур'ёзная і прыгожая цацка...

Гэта лірыка, а на самай справе асноўная маса старых грошай будзе вынята з абарачэння праз касы магазінаў, аддзяленняў банкаў і іншых структур, якія прымаюць гатоўку ад кліентаў. Потым гэтыя паперы здаюцца арганізацыямі ў падраздзяленне Нацбанка, абменьваюцца на новыя, а старыя купюры ўтылізуюцца. Нам спецыяльна ісці ў банк для абмену не трэба, бо на працягу 6 месяцаў два ўзоры грошай будуць мець паралельнае абарачэнне. Але я амаль упэўнены, што ва ўсіх буйных і сярэдніх гарадах краіны старых грошай на руках у насельніцтва ўжо і не застанецца нават праз адзін — два месяцы. Заробкі мы атрымліваем у асноўным па картцы, а банкаматы на працягу ліпеня фінансісты абяцаюць перавесці выключна на новыя грошы. А грошы пад матрацам сёння нiхто ўжо ці амаль ніхто не хавае.

Калі з нейкіх прычын і да пачатку наступнага года ў кагосьці застануцца старыя грошы, то іх абмен будзе ажыццяўляцца без абмежаванняў і без спагнання ўзнагароджання з 1 студзеня 2017 года па 31 снежня 2019-га — у Нацыянальным банку, банках і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях Беларусі, а з 1 студзеня 2020-га па 31 снежня 2021 года — у Нацыянальным банку. Часу на падобную «ракіроўку» хапае.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### ЧЭРГІ НА КАСАХ ПАДАЎЖЭЮЦЬ

Аб гэтым днямі заявіў намеснік міністра гандлю Эдвард Матуліс. І выправіць сітуацыю з імі будзе даволі складана, бо цяпер касірам неабходна будзе апераваць 9 банкнотамі старога ўзору, 7 — новага і плюс манеты. А гэта можа істотна знізіць хуткасць абслугоўвання пакупнікоў.

Намеснік міністра адзначыў яшчэ адзін нюанс. Сёння ў краіне дзейнічае каля 250 тысяч касавых апаратаў, сярод якіх дастаткова і старых. Таму прыкладна да канца года ў касавым чэку можа стаяць сума ў недэнамінаваных грашах, а вось у карт-чэку — у новых. Нічога страшнага ў гэтым няма, лічыць Эдвард Матуліс, бо і рэшту кліенту могуць адначасова даваць як новымі, так і старымі купюрамі.

СТАР. 4

# КРОКІ НАСУСТРАЧ

## Наша краіна выступае за наладжванне адносін з Чэхіяй

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з міністрам замежных спраў Чэшскай Рэспублікі Любамірам Зааралекам.**

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што раней паміж Беларуссю і Чэхіяй шмат было агульнага. «Не скажу, што ўсё было бясхмарна, але больш, я лічу, было добрага, чым дрэннага ў нашых адносінах, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — У гісторыі шмат было станоўчага і адмоўнага, мы павінны рабіць з гэтага адпаведныя высновы. Я гэта сказаў для таго, каб падвесці вас да думкі, што ўсё ж такі мы знайшлі ў сабе сілы пераламаць сітуацыю, і цяперашняя сітуацыя характарызуецца наладжваннем добрых адносін паміж еўрапейскімі дзяржавамі, Беларуссю і Чэхіяй перш за ўсё». Прэзідэнт Беларусі асабліва адзначыў важную ролю Чэхіі ў вызначэнні еўрапейскай палітыкі.

У сваю чаргу Любамір Зааралек выказаў меркаванне, што настаў час пачаць новую старонку ў адносінах Беларусі і Чэхіі.

# ВАЖНАЯ ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ КОЖНАГА

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды заслужаным людзям краіны. Урачыстая цырымонія адбылася ўчора ў Палацы Незалежнасці.**

«Перад нашай краінай стаяць вельмі адказныя задачы, якія мы нядаўна абмяркоўвалі на Усебеларускім народным сходзе. Ад жыццёвай пазіцыі кожнага з вас, напружанай працы залежыць тое, вырашым мы гэтыя задачы ці не, – сказаў Прэзідэнт. – У жыцці дзяржавы няма другарадных сфер. Умацаванне абараназдольнасці і бяспекі, развіццё галін эканомікі, адукацыі, навукі, культуры, спорту, рашэнне пытанняў сацыяльнай абароны — усё гэта разам фарміруе дабрабыт нашай дзяржавы».

Узнагароды ўручаны сарака прадстаўнікам розных сфер дзейнасці за шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў, значны асабісты ўклад у пераадоленне наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў, развіццё навуковай і педагагічнай дзейнасці, сферы аховы здароўя, культуры і спорту.

Ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджаны старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік і намеснік генеральнага пракурора Беларусі Аляксандр Лашын.

Памочнік міністра абароны па ідэалагічнай працы ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Аляксандр Гура ўганараваны ордэнам «За службу Радзіме» II ступені. Шэрагу прадстаўнікоў слаўных структур таксама ўручаны ордэны «За службу Радзіме» III ступені.

Кіраўнікі розных узроўняў адзначаны ордэнам Пашаны. У іх ліку віцэ-прэм'ер Міхаіл Русы, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатоль Русецкі, міністр інфармацыі Лілія Ананіч.

Віктар Таранцей, загадчык кафедры педагогікі і сацыяльнай работы Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны.

Прадстаўнікам розных прафесій, кіраўнікам арганізацый і ведамстваў уручаны таксама медалі «За адзнаку ў папярэджанні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый», «За працоўныя заслугі», медалі Францыска Скарыны, прысвоены ганаровыя званні заслужанага артыста, работніка адукацыі, заслужанага юрыста, металурга, работніка фізічнай культуры і спорту, заслужанага трэнера і майстра спорту, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

■ Парламенцкі дзённік

# ІЗНОЎ ПРА МАДЭРНІЗАЦЫЮ

**У сталіцы адбылося сумеснае пасяджэнне Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. Намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір СЯМАШКА выступіў перад парламентарыямі з дакладам аб рабоце прамысловага і паліўна-энергетычнага комплексаў краіны.**

Паводле яго слоў, беларуская прамысловасць як асноўны фактар, які вызначае прыярытэтныя напрамкі развіцця эканомікі краіны, сёлета штомесяц дэманструе больш высокія паказчыкі росту ў параўнанні з партнёрамі па ЕАЭС. Віцэ-прэм'ер адзначыў, што гэта адбываецца дзякуючы прынятым з канца 2015—пачатку 2016 года мерам па стабілізацыі макраэканамічнай сітуацыі. Так за пяць месяцаў ВУП прырос на 1,5%. Пры гэтым асноўны ўклад у аднаўленне ўзроўню ВУП робяць прадпрыемствы прамысловасці. Тэмп росту вытворчасці апошніх дасягнуў 98,1% па выніках пяці месяцаў. Да студзеня дадалося 4,9 працэнтнага пункта.

Уладзімір Сямашка таксама нагадаў, што ў папярэднія гады да 70% экспарту прамысловасці прыпадала на Расію, але ўжо летась экспарт у гэтую краіну склаў 58% з прычыны пераарыентацыі прамысловых паставак на новыя рынкі краін далёкага замежжа. Гэта з'яўляецца важным фактарам для нашай краіны з-за адкрытасці яе эканомікі і неабходнасці экспартаваць да 65% выпушчанай прадукцыі на знешнія рынкі.

Уладзімір Сямашка паведаміў, што арганізацыямі Мінпрама ўжо распрацаваны бізнес-планы развіцця на сярэднетэрміновы перыяд, а таксама падрыхтаваны праект праграмы развіцця арганізацый Міністэрства прамысловасці на 2016—2020 гады. Дзяржаўныя праграмы плануецца прыняць не пазней ліпеня гэтага года.

Пры гэтым віцэ-прэм'ер адзначыў, што арганізацыі Мінпрама недастаткова займаліся мадэрнізацыяй сваіх вытворчасцяў, стварэннем інавацыйных і інвестыцыйных праектаў. У момант, калі адбыўся сусветны крызіс і далейшы эканамічны спад, аказалася, што яны не былі гатовыя даць такі прадукт, які, нягледзячы на ўсе праблемы рынку, дазволіў бы дыктаваць цэнавыя ўмовы. На думку намесніка прэм'ер-міністра, прадпрыемствы, якія падпарадкоўваюцца Мінпраму, маюць патрэбу ў сур'ёзнай мадэрнізацыі. Такія праграмы абмяркоўваюцца.

# АБАРОНА ЎНУТРАНАГА РЫНКУ

**На заключным пасяджэнні дзявятай сесіі Палаты прадстаўнікоў дэпутаты разгледзелі чатыры праекты законаў.**

Па словах **члена Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Наталлі ГУЙВІК**, змяненні і дапаўненні ў Крымінальны кодэкс, Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях прадугледжваюць узмацненне адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне патрабаванняў тэхрэгламентаў Мытнага саюза (МС) і ЕАЭС. Новыя нормы накіраваны на абарону айчыннага рынку ад паставак няякаснай прадукцыі.

Пры падрыхтоўцы да другога чытання праект закона быў істотна дапрацаваны. Па прапанове Савета Міністраў унесены змены па зніжэнні памеру штрафаў за парушэнне патрабаванняў тэхрэгламентаў МС і ЕАЭС. Такія змены таксама забяспечаць суб'ектам гаспадарання Беларусі ўмовы прыцягнення да адказнасці суразмерныя з аналагічнымі ў Расіі і Казахстане.

Акрамя гэтага, паводле слоў дэпутата, у праекце закона аб'яднана яшчэ восем законапраектаў, якія былі перададзены ў Камісію па заканадаўстве з іншых камісій. Напрыклад, у Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях уводзяцца артыкулы, якія прадугледжваюць адміністрацыйную адказнасць за незаконны пошук і абарачэнне археалагічных артэфактаў.

Таксама ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях уводзіцца артыкул, які ўстанаўлівае адказнасць за незаконныя дзеянні з некурыльнымі тытунёвымі вырабамі.

**Міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ**, каментуючы законапраект «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі», адзначыў, што з'явіўся новы артыкул, які датычыць цэлага комплексу мерапрыемстваў, звязаных з навучаннем і прасоўваннем моладзі на кіруючыя пасады. Акрамя таго, пашыраны функцыі Міністэрства адукацыі, якія робяць яго галоўным дзяржаўным органам па каардынацыі маладзёжнай палітыкі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
Kryzhevich@zviazda.by

# КОДЭКС АБ КУЛЬТУРЫ ЎХВАЛЕНЫ

**На заключным пасяджэнні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі было горача: разгледзелі 27 пытанняў. Адно з іх, доўгачаканае, якое ўдакладнялася не адзін год, — Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры. «Гэта сапраўдны падарунак ад заканатворцаў сферы культуры ў Год культуры», — так назвала ўхвалены законапраект Святлана САРОКА, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі, дырэктар Палаца культуры Маладзечна.**

Па яе словах, для таго, каб зрабіць кодэкс максімальна набліжаным да рэчаіснасці, больш жыццёвым, Пастаяннай камісіяй быў праведзены маніторынг. «Важна, што гэты дакумент адкрые шырокія перспектывы для прыцягнення ў культуру інвестыцый на аснове дзяржаўна-прыватнага партнёрства, развіцця традыцый мецэнацтва, падтрымкі культурных інавацый», — лічыць сенатар.

Рэвалюцыйных змен Кодэкс аб культуры не нясе, ён сістэматызуе існуючае заканадаўства ў сферы і ўдакладняе яго, лічыць **Ірына ДРЫГА, першы намеснік міністра культуры.** «З іншага боку, у ім шмат інавацый, — **кажа Мікалай КАЗАРАВЕЦ, старшыня Пастаяннай камісіі.** — Напрыклад, цяпер творчым чалавекам афіцыйна можа лічыцца не толькі член творчага калектыву. Для асобы творчай, якая не імкнецца ўступаць у аб'яднанні, гэта важна. Таксама асобна ўдакладняецца, як арганізоўваць культурныя масавыя мерапрыемствы, выставы. Цяпер пра гэта можна даведацца з аднай крыніцы».

Яшчэ адным пытаннем пасяджэння стала ўхваленне новай рэдакцыі Ваеннай дактрыны Беларусі. Па словах **Андрэя РАЎКОВА, міністра абароны,** яна — базіс у забяспячэнні ваеннай бяспекі краіны. «Навізна дактрыны ў тым, што ў ёй разглядаюцца ўсе варыянты і віды магчымых узброеных канфліктаў і агрэсіі ў дачыненні да краіны, у тым ліку і гібрыдная вайна, і ўзброеныя выступленні, скіраваныя супраць тэрытарыяльнай цэласнасці і суверэнітэту дзяржавы ўнутры краіны. Пры гэтым акцэнтуецца ўвага з аднаго боку на тое, што мы працягваем стратэгічнае партнёрства з Расіяй, з другога — мы адкрыты для супрацоўніцтва з іншымі вайсковымі арганізацыямі, у тым ліку НАТА. Але пры адной умове: безумоўным прыярытэце нацыянальных інтарэсаў», — адзначыў **Ігар МАРЗАЛЮК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, загадчык кафедры Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова, доктар гістарычных навук, прафесар.**

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

■ Пра гэта гаварылася на Народным сходзе

# АМБУЛАТОРЫЯ АГУЛЬНАЙ ПРАКТЫКІ

## Як у раёнах імкнуцца захоўваць даступнасць меддапамогі?

**Тлумачыць галоўны ўрач Глыбоцкай цэнтральнай раённай бальніцы Вячаслаў САБЫНІЧ:**

— Гаворачы аб ахове здароўя, Прэзідэнт звярнуў увагу ў тым ліку на неабходнасць далейшага развіцця ўсіх звёнаў аховы здароўя — ад ФАПа да цэнтраў, забяспячэнне паэтапнага пераходу да дзейнасці ўчастковай службы па прынцыпе каманды: урач агульнай практыкі, яго памочнік па амбулаторна-паліклінічнай дапамозе, медсястра... Трэба заўважыць, сёлета да нас прыедуць 15 маладых спецыялістаў. Акурат столькі, колькі нам патрэбна.

Пяцёра з іх — жыхары раёна з мэтавымі накіраваннямі. Усе мэтавыя накіраванні — толькі для дзвюх спецыяльнасцяў, урача агульнай практыкі і ўрача-педыятра, яны будуць працаваць належныя пяць гадоў. Астатнія, а гэта ўрачы-тэрапеўты, хірург, анестэзіёлагі-рэаніматолагі, гінеколаг, дэрматавенеролаг, стаматолаг і неўролаг — толькі два гады, а таму, каб затрымаць іх на большы час, пастараемся зацікавіць. Пры заключэнні працоўных кантрактаў устанаўліваецца павышэнне тарыфнай стаўкі ад 10 да 50%, прадугледжаны надбаўкі за складанасць і напружанасць працы да 50%; усім спецыялістам прадастаўляецца магчымасць працаваць па сумяшчальніцтве; аказваецца матэрыяльная дапамога паводле калектыўнага дагавора; маладым спецыялістам прадастаўляюцца па іх заявах ільготныя крэдыты на набыццё жылля, таксама яны маюць магчымасць прафесійнага росту, павышэння кваліфікацыі. Усе, каму спатрэбіцца, а гэта шэсць чалавек, будуць забяспечаны пакоем у інтэрнаце або арэндным жыллём.

У Глыбоцкім раёне працуюць 32 установы аховы здароўя — Глыбоцкая цэнтральная раённая бальніца, Падсвільская раённая бальніца, акрамя таго, тры бальніцы сястрынскага догляду, пяць амбулаторый урача агульнай практыкі, 22 фельчарска-акушэрскія пункты. У самім райцэнтры ёсць яшчэ два пункты аховы здароўя на базе прафесійнага ліцэя і глыбоцкіх электрасетак. Скарачаць колькасць ФАПаў мы не плануем нават там, дзе ў іх зацікаўлена невялікая колькасць насельніцтва. Усё ж такі раён досыць вялікі — працягласцю 66 км, а таму закрыццё любой установы можа стварыць пэўныя нязручнасці і знізіць даступнасць медыцынскіх паслуг. Арганізавана работа выязных урачэбна-консультацыйных брыгад Глыбоцкай ЦРП для аказання кансультацыйнай, дыягнастычнай і лячэбнай дапамогі сельскаму насельніцтву.

Усе амбулаторыі працуюць па прынцыпе ўрача агульнай практыкі. Для паляпшэння даступнасці медыцынскай дапамогі з 1 верасня 2015 года пасля правядзення рамонтных работ у Глыбоку адкрылася амбулаторыя ўрача агульнай практыкі, у якой арганізавана дзейнасць па абслугоўванні чатырох гарадскіх участкаў. Урачы агульнай практыкі маюць падрыхтоўку па сумежных спецыяльнасцях — неўралагічная дапамога, вызначэнне вастрыні зроку і падбор лінзаў, лячэнне ЛОР-захворванняў. Улічваючы, што на ўчастках пераважае пераважна сталае насельніцтва, у амбулаторыі прадугледжана зручная магчымасць забору крыві для правядзення лабараторных даследаванняў, выконваецца і электракардыяграфія.

Такім чынам, нам удалося разгрузіць цэнтральную раённую паліклініку — усё ж такі многім патрэбна толькі назіранне і карэкцыя прызначанага раней лячэння. На базе нашай бальніцы працуе і кабінет прафілактыкі, ёсць спецыяліст—валеолаг, які праводзіць работу, скіраваную на фарміраванне здаровага ладу жыцця.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

# УДАСКАНАЛЕННЕ ЗАКАНАДАЎСТВА — БАЗАВАЯ ЎМОВА ПАСЛЯХОВАЙ РЭАЛІЗАЦЫІ РАШЭННЯЎ ПЯТАГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ

*Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі МЯСНІКОВІЧА М.В. на закрыцці адзінаццатай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 30 чэрвеня 2016 г.*



**Паважаныя члены Савета Рэспублікі і запрошаныя!**

Сёння завяршае работу адзінаццатая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

**1. Аб выніках адзінаццатай сесіі.**

У перыяд сесіі праведзена 5 пасяджэнняў Савета Рэспублікі, прынята 75 пастаноў Савета Рэспублікі, ухвалена 58 законапраектаў, прыняты да ведама 2 дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гэтыя рашэнні Савета Рэспублікі забяспечаць далейшае ўдасканаленне нацыянальнага заканадаўства.

Аб некаторых ключавых нарматыўных прававых актах.

**Прынятыя два комплексныя дакументы —** новая рэдакцыя Ваеннай дактрыны Рэспублікі Беларусь і Кодэкс аб культуры Рэспублікі Беларусь. Сімвалічна, што Кодэкс аб культуры мы прынялі ў Год культуры, аб'яўлены ў нашай краіне сёлета.

**У парадку рэалізацыі нарматворчай ініцыятывы** Савет Рэспублікі і спецыялісты сакратарыята садзейнічалі Міністэрству ўнутраных спраў у падрыхтоўцы праекта нарматыўнага прававога акта па ўзмацненні адказнасці за незаконныя дзеянні з некурыльнымі тытунёвымі вырабамі. Сёння Савет Рэспублікі падтрымаў гэтыя вельмі актуальныя прапановы, ухваліўшы законапраект «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях». Зробленыя намі захады будуць спрыяць стварэнню ўмоў для бяспечнага развіцця дзяцей і моладзі, а таксама ліквідацыі перадумоў для распаўсюджвання наркаманіі ў нашай краіне.

**Паважаныя члены Савета Рэспублікі!**

У сесійны перыяд Саветам Рэспублікі быў рэалізаваны **шэраг важных мерапрыемстваў міжнароднага характару.**

Перш за ўсё — гэта **трэці Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі.** Дзякуючы падтрымцы Прэзідэнтамі Беларусі і Расіі гэтай ініцыятывы Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі, форумы сталі сістэмным і эфектыўным інструментам рэгіянальнага супрацоўніцтва.

У перыяд мерапрыемстваў трэцяга Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі падпісана 39 пагадненняў, заключана камерцыйных кантрактаў **больш чым на 300 млн долараў ЗША.** Але супакойвацца на гэтым не варта. Мы павінны генерыраваць новыя формы ўзаемадзеяння з нашым галоўным эканамічным і палітычным партнёрам. Цэлы шэраг даручэнняў і падыходаў Прэзідыум Савета Рэспублікі ўжо зацвердзіў.

Асаблівую ўвагу варта ўдзяліць выкананню даручэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі па наладжванні **больш паўнавартаснага эканамічнага і сацыяльна-палітычнага супрацоўніцтва на ўзроўні органаў мясцовага самакіравання Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.**

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь будзе аказваць абласным і гар-, райсаветам дапамогу і садзейнічанне ва ўмацаванні супрацоўніцтва з расійскімі партнёрамі — абласнымі думамі, абласнымі і гарадскімі заканадаўчымі сходамі.

Прапрацоўку адпаведных падыходаў ажыццяўляе Пастаянная камісія па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні. Да гэтай працы будзе падключаны і Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання Рэспублікі Беларусь. Але, падкрэсліваю, будзем працаваць паралельна: на ўзроўні рэгіён—рэгіён і Савет Рэспублікі — Савет Федэрацыі.

Са Старшынёй Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі В.І. Мацвіенкай я дамовіўся аб парадку правядзення гэтай адказнай працы, якая ў Магілёўскай, Брэсцкай і Гомельскай абласцях ужо пачалася.

**2. Аб рашэннях пятага Усебеларускага народнага сходу і задачах на пяцігодку.**

**Паважаныя члены Савета Рэспублікі!**

Усе мы **знаходзімся пад уражаннем пятага Усебеларускага народнага сходу.** Аб'ектыўныя ацэнкі і актуальныя рашэнні сходу вызначаюць стратэгію і тактыку сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны на наступныя пяць гадоў і перспектыву.

Якая роля Савета Рэспублікі ў вырашэнні гэтых задач?

Яна шматгранная і адказная.

У першую чаргу — гэта заканатворчая дзейнасць.

Для паспяховай рэалізацыі Асноўных палажэнняў праграмы, а таксама рашэнняў і задач пяцігодкі 2016—2020 **неабходна прыняць 168 нарматыўных прававых актаў.** Не выключана, што гэтая лічба можа быць удакладнена з улікам прыняцця Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2016—2020 гады, работа над якой сёння вядзецца на базе асноўных палажэнняў, прынятых пятым Усебеларускім народным сходам.

Разам з тым мы павінны больш актыўна весці прававы маніторынг дзеючага заканадаўства, устараняць прабелы і калізіі.

**Па-другое,** ідэі і даручэнні, выказаныя на пятым Усебеларускім народным сходзе Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, дэлегатамі Сходу, павінны быць уважліва вывучаны членамі Савета Рэспублікі з мэтай іх рэалізацыі ў нашай парламенцкай дзейнасці.

**Трэцяе.** Ужо сёння відавочна, што больш актыўнай павінна быць работа членаў Савета Рэспублікі і мясцовых Саветаў дэпутатаў. Асаблівая ўвага павінна быць нададзена рэалізацыі прыярытэтаў: занятасць, інвестыцыі, экспарт, інфарматызацыя, моладзь.

**3. Аб выбарах у Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь.**

**Паважаныя члены Савета Рэспублікі!**

Адзінаццатая сесія Савета Рэспублікі завяршае сваю работу ў перыяд пачатку важнай палітычнай падзеі — **выбараў у Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь.** Выбарчая кампанія стартавала. Яна будзе праходзіць **адкрыта, дэмакратычна, у поўнай адпаведнасці з беларускім заканадаўствам.** Такая мая выснова заснавана на тым, што ў краіне створаны ўсе ўмовы для сумленных і годных выбараў.

У сувязі з гэтым я і, мяркую, увесь склад Савета Рэспублікі зычым поспехаў тым, хто вырашыць балатавацца на маючых адбыцца выбарах у Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь шостага склікання.

Напрыканцы хачу падзякаваць усім вам за зладжаную і плённую працу ў перыяд адзінаццатай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання, пажадаць вам і вашым блізкім моцнага здароўя і дабрабыту.

# ЗРАБІЦЬ УСЁ ДЛЯ ВЫКАНАННЯ ЗАДАЧ, ПАСТАЎЛЕНЫХ НАРОДАМ

*Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў АНДРЭЙЧАНКІ У.П. на закрыцці дзявятай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 30 чэрвеня 2016 г.*



**Паважаныя дэпутаты, члены Урада і запрошаныя!**

Завяршаецца дзявятая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

Цэнтральнай падзеяй сесіі стала Пасланне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь беларускаму народу і парламенту. Перад дэпутатамі былі пастаўлены задачы не зніжаць тэмпы заканадаўчай дзейнасці, садзейнічаць забеспячэнню эканамічнай і сацыяльнай стабільнасці, павышэнню палітычнага іміджу і замацаванню эканамічных пазіцый Беларусі на міжнароднай арэне.

Менавіта ў такім ключы і была арганізавана работа Палаты прадстаўнікоў пры абмеркаванні Праграмы дзейнасці ўрада на 2016—2020 гады і новай Ваеннай дактрыны — дакументаў, якія ляглі ў аснову стратэгіі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на будучую пяцігодку.

На сесіі таксама разгледжаны актуальныя пытанні рэалізацыі бюджэтнай палітыкі, рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў, укаранення прынцыпаў «зялёнай» эканомікі, занятасці насельніцтва.

Выканана сур'ёзная работа па гарманізацыі заканадаўства ў рамках ЕАЭС. Навацыі закранулі пытанні тэхнічнага рэгулявання, павышэння эфектыўнасці транзітнага патэнцыялу і аўтамабільных перавозак.

Пагадненне Еўразійскага эканамічнага саюза аб свабодным гандлі з В'етнамам не толькі аблегчыць бяспошлінны доступ айчынных тавараў на рынак гэтай краіны, але і дазволіць стварыць добрыя пляцоўкі для актывізацыі гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з дзяржавамі АСЕАН.

Скрозь прызму патрабаванняў кіраўніка дзяржавы і рашэнняў пятага Усебеларускага народнага сходу разгледжаны праект закона па пытаннях дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, які адкрывае дадатковыя магчымасці для ініцыятывы і творчасці маладых.

Завершана вялікая работа над Кодэксам аб культуры, які прайшоў шырокае грамадскае абмеркаванне.

Актыўнае правядзенне Рэспублікай Беларусь шматвектарнай знешняй палітыкі абумовіла інтэнсіўнасць парламенцкай міжнароднай праграмы.

Асноўны ўпор тут быў зроблены на прасоўванне нацыянальных інтарэсаў, рэалізацыю праектаў эканамічнага супрацоўніцтва.

У ліку асноўных нашых прыярытэтаў застаецца саюзнае будаўніцтва. На пяцідзясятай юбілейнай сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі былі абмеркаваны шляхі павышэння эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў, аптымізацыі працэсу прыняцця і выканання саюзных праграм, ліквідацыі бюракратычных бар'ераў, якія перашкаджаюць дзелавой актыўнасці.

Пра тое, як можна ўзаемадапаўняць патэнцыялы ЕАЭС і эканамічнага пояса Шаўковага шляху, ішла размова на першай нарадзе спікераў парламентаў краін Еўразіі ў г. Маскве, а таксама на міжнародным форуме «Адзін пояс, адзін шлях» у Ганконгу, у рабоце якіх мы ўдзельнічалі.

Новы імпульс атрымала развіццё беларуска-тайландскіх адносін. Літаральна ўчора завяршыўся афіцыйны візіт у Рэспубліку Беларусь дэлегацыі на чале са спікерам парламента Каралеўства Тайланд. Падчас праведзеных сустрэч мы намецілі рэальныя перспектывы па нарошчванні аб'ёмаў тавараабароту, наладжванні прамых сувязяў паміж рэгіёнамі, рэалізацыі ідэй першага Беларуска-Тайландскага бізнес-форуму.

Добрую дынаміку паказвае еўрапейскі вектар супрацоўніцтва. Распачаты адкрыты дыялог з парламентарыямі Аўстрыі, Балгарыі, Вялікабрытаніі, Венгрыі, Італіі, Латвіі, Польшчы, Румыніі, Славакіі сведчыць аб узаемнай зацікаўленасці і нармалізацыі адносін.

Канкрэтныя накірункі супрацоўніцтва ў сферах адукацыі, экалогіі, энергетыкі, аховы здароўя і турызму абмеркаваны з кіраўніцтвам Парламенцкай канферэнцыі Балтыйскага мора. Мы праяўляем сур'ёзны інтарэс да дзейнасці гэтай арганізацыі і вывучаем магчымасць атрымання ў ёй статусу назіральніка.

Актывізаваліся нашы кантакты з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы. У становучы бок мяняюцца фармат сустрэч, іх тэматыка і змест. «Круглы стол» па пытаннях удасканалення выбарчага працэсу, які прайшоў у Палаце прадстаўнікоў, быў карысны ўсім яго ўдзельнікам.

Мы спрабуем знайсці рэальныя пункты сутыкнення і, зразумела, працягнем дыялог у тым ліку ў ходзе міжнароднага назірання за парламенцкімі выбарамі ў Беларусі.

Гэта ў роўнай ступені датычыць і нашых калег з ПА АБСЕ. Сёння беларуская дэлегацыя накіроўваецца ў г. Тбілісі для ўдзелу ў яе штогадовай летняй сесіі.

Тэма сесіі «25 гадоў парламенцкага супрацоўніцтва: умацаванне даверу шляхам дыялогу» адсылае да важнай гістарычнай падзеі — прыняцця Мадрыдскай дэкларацыі, якая заклала аснову парламенцкага складніка АБСЕ.

Гэты візіт важны для нас яшчэ і таму, што на ёй будзе прынята канчатковае рашэнне аб правядзенні ў 2017 годзе летняй сесіі гэтай аўтарытэтнай міжнароднай арганізацыі ў г. Мінску.

**Паважаныя калегі!**

З завяршэннем сесіі мы ўшчыльную падыходзім да заканчэння тэрміну нашых паўнамоцтваў. Астатні час павінен быць максімальна эфектыўна выкарыстаны для вырашэння пастаўленых перад намі задач.

Ужо цяпер неабходна рыхтаваць канкрэтныя прапановы ў пакет бюджэтных законапраектаў на 2017 год, з тым каб у кастрычніку на заключнай сесіі парламента мы змаглі прыняць сапраўды якасныя дакументы.

Яшчэ адно важнае даручэнне кіраўніка дзяржавы датычыць інвестыцыйнага заканадаўства. Урад павінен да 1 верасня прадставіць прапановы па яго ўдасканаленні. Профільным камісіям трэба прыняць самы актыўны ўдзел у гэтай працы, тым больш што прыцягненне прамых інвестыцый у эканоміку — гэта адзін з асноўных прыярытэтаў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступную пяцігодку.

Рашэнні пятага Усебеларускага народнага сходу змяшчаюць дакладныя мэты і арыенціры далейшага руху наперад. Аднак іх дасягненне залежыць ад мабілізацыі ўсіх матэрыяльных і інтэлектуальных сіл краіны.

Менавіта дэпутаты, працуючы ў выбарчых акругах, растлумачваючы асноўныя палажэнні праграмных дакументаў, павінны стаць гэтай мабілізуючай сілай.

Тым больш што краіна ўступае ў вельмі адказны перыяд. Наперадзе ў нас кампанія па выбарах у парламент. На выбарах будзе працаваць вялікая колькасць міжнародных назіральнікаў. Палата прадстаўнікоў ужо запрасіла нашых калег з Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, Міжпарламенцкай асамблеі СНД, парламенцкіх асамблей АБСЕ, АДКБ, ПАСЕ.

Трэба дапамагчы арганізаваць іх работу такім чынам, каб сусветная супольнасць змагла наглядна пераканацца, што выбары ў нас праходзяць спакойна, адкрыта і дэмакратычна, у адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам і міжнароднымі стандартамі.

Упэўнены, што новы склад дэпутацкага корпуса забяспечыць пераемнасць курсу на стварэнне моцнай і квітнеючай Беларусі.

Напрыканцы, паважаныя калегі, хачу падзякаваць вам за плённую працу і павіншаваць усіх прысутных з надыходзячым святам — Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

■ Будзь у курсе!

## Ёсць пытанні па дэнамінацыі?

**Міністэрства гандлю абвясціла тэлефоны «гарачай лініі» па пытаннях дэнамінацыі, што будуць працаваць 1-3 ліпеня. Пазваніць па іх можна будзе з 9 да 18 гадзін.**

Арганізацыя гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання насельніцтва (афармленне цэннікаў, праца касавага і вагавага абсталявання, плацежных тэрміналаў, разлікі з пакупнікамі): + 375-29-580-44-75, 327-63-45, 327-12-26.

Цэнаўтварэнне: 1 ліпеня — 327-79-95, 2 ліпеня — 327-61-21, 3 ліпеня — 327-79-95.

Бухгалтарскі ўлік і справаздачнасць: 1 ліпеня — 200-99-67, 2 ліпеня — 200-99-67, 3 ліпеня — 327-03-96.

Выкананне заканадаўства ў сферы гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання насельніцтва: 1 ліпеня — 327-25-97, 2 ліпеня — 327-25-97, 3 ліпеня — 327-09-58.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Нацбанк паведамляе

## АБМЕН БАНКНОТ НА МАНЕТЫ — ДА ПАЧАТКУ РАБОТЫ ГАНДЛЁВЫХ АБ'ЕКТАЎ

***У межах падрыхтоўкі да правядзення дэнамінацыі* Нацыянальным банкам краіны прыняты ўсе неабходныя рашэнні і нарматыўныя прававыя акты, якія забяспечваюць дастаўку ў рэгіёны і банкі краіны грашовай наяўнасці ўзору 2009 года, дастатковай для першапачатковай выдачы, паведамляе прэс-служба ўстановы.**

У дакуменце гаворыцца, што на працягу ліпеня будзе забяспечана максімальная загрузка банкаматаў банкнотамі ўзору 2009 года, а ўжо з 1 ліпеня новымі грашыма будзе загружана каля 30% банкаматаў банкаў краіны. Таксама з 1 ліпеня арганізацыя банкаўскіх аперацый, уключаючы валютна-абменныя, будзе ажыццяўляцца з выкарыстаннем грашовай наяўнасці ўзору 2009 года разам з грашовай наяўнасцю ўзору 2000 года.

Спецыялісты Нацбанка паведамляюць, што былі прыняты ўсе неабходныя захады па абнаўленні праграмнага забеспячэння плацежных тэрміналаў, якія ўстаноўлены ў арганізацыях гандлю (сэрвісу), для працы з новым кодам валюты (BYN, 933). У выпадках, калі такая праца плацежных тэрміналаў не можа быць забяспечана па прычыне непадрыхтаванасці спалучанага касавага абсталявання, арганізацыям гандлю (сэрвісу) прадастаўлена магчымасць устаноўкі і выкарыстання аўтаномных плацежных тэрміналаў.

Рашэнне аб замене альбо даабсталяванні прылад па прыёме гатоўкі ў частцы прыёму манет банкі будуць прымаць самастойна, зыходзячы з тэхнічных магчымасцяў. 1 ліпеня і ў наступныя дні будуць прыняты ўсе неабходныя захады для забеспячэння бесперабойнай работы банкаўскіх плацежных картак і тэрміналаў абсталявання.

У асаблівым рэжыме будзе працаваць і кантакт-цэнтр Нацыянальнага банка. Атрымаць неабходныя кансультацыі можна будзе па тэлефоне ў Мінску 306-00-02 з 9.00 да 17.00 як у пятніцу 1 ліпеня, так і ў выхадныя дні — 2 і 3 ліпеня. Акрамя таго, у Нацыянальны банк можна звярнуцца з дапамогай спецыяльнай электроннай формы, якая размешчана на сайце рэгулятара ў рубрыцы «Дэнамінацыя-2016».

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

## У ліпені стаўка рэфінансавання — 20%

**Нацыянальны банк краіны з першых дзён ліпеня зніжае стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях падтрымкі бягучай ліквіднасці на два працэнтныя пункты — з 27% да 25% гадавых, а таксама зніжаюцца стаўкі па пастаянна даступных аперацыях выключэння ліквіднасці банкаў — з 15% да 13% гадавых.**

Акрамя таго, як паведамлялася раней, з 1 ліпеня зніжаецца стаўка рэфінансавання — з 22% да 20% гадавых. У Нацбанку адзначылі, што прыняццю гэтых рашэнняў спрыяла перш за ўсё запаволенне інфляцыйных працэсаў. Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі, прырост спажывецкіх цэн у маі 2016 года знізіўся да 0,5% у адносінах да красавіка і да 12,4% у адносінах да мая мінулага года.

**Сяргей ПАЛІНІН.**

# І АТРЫМАЎ РУБЕЛЬ ПРЫЕМНУЮ ВАГУ



### СПАЧАТКУ ВЫВУЧЫЦЬ, А ПОТЫМ БРАЦЬ

Знаёміцца з новымі каштоўнымі паперамі мы пачнём пасля таго, як атрымаем іх у банкамаце. Гэта ў ідэале. А калі прадавец (пакупнік) у першыя дні ліпеня наведае рынак і ў рукі яму там трапляюць новыя грошы, з якімі ён яшчэ добра і не пазнаёміўся? Ці існуе верагоднасць, што разлічваць (даваць рэшту) з ім будуць не зусім «правільнымі» грашыма? Будзем спадзявацца, што наш чалавек дастаткова пільны і ў падобную сітуацыю ніколі не трапіць, але...

Гэта касір павінен быць падрыхтаваны і ведаць новыя купюры «ў твар» з першых гадзін раніцы пасля дэнамінацыі, а вяскоўай бабулі для дакладнай ідэнтыфікацыі сучасных банкнотаў пэўны час спатрэбіцца. Таму я параіў бы нашым бацькам пры прыватным разліку з незнаёмымі людзьмі гэтыя новыя купюры браць з вялікай асцярогай або папрасіць разлічыцца добра вядомымі купюрамі ўзору 2000 года. Праўда, і ў агучаным выпадку ёсць выйсце, калі ў дробнага гандляра на рынку ў кашальку будуць тры новыя купюры — 5, 10 і 20 рублёў. Тады свае сапраўдныя банкноты можна будзе параўноўваць з грашыма пакупніка.

А вось жартаваць з нацыянальнай валютай я не раіў бы нікому, бо гэта бокам можа выйсці. Тут будзе не лішнім сказаць некалькі слоў пра сувенірныя грошы. У галоўным упраўленні наяўнага грашовага абарачэння Нацбанка нам паведамілі, што выраб вырабаў банкнотаў можа выконвацца на матэрыяльных і нематэрыяльных носьбітах. Але пры гэтым ёсць пэўныя ўмовы: пры аднабаковай выяве носьбіта памер копіі павінен складаць менш за 75% або больш за 125% ад рэальнага памеру банкнотаў. Пры двухбаковым выкананні — менш за 50% або больш за 200% ад арыгінала. А мы ведаем, што сапраўдная даўжыня 5-рублёвага банкнота ў нас складае 135 мм, 10-рублёвага — 139 мм, а 20-рублёвага — 143 мм. Дастаткова мець пад рукой тры кардонкі падобнага памеру і праблем з «банкам прыколаў» у вас не будзе.

### БАРАЦЬБА З ДЗІРКАМІ

А тым, хто любіць прыхаваць свае кроўныя на «ўсялякі выпадак», я параіў бы ў найбліжэйшы час перагледзець кішэні пінжакоў, паліто, штаноў, зазірнуць у старыя кашалькі і сумачкі. Ёсць нагода навесці парадак у шафе, а магчыма, крышку і разбагацець.

На кішэнях трэба спыніцца асобна. Манет у нас не было ўжо даўнавата, таму пры ўзнікненні невялікай дзірачкі яе можна і не заўважыць. Аднак дробная новая манета такую прарэху адшукае абавязкова. Вось і яшчэ працы рэгулятар нашым жонкам дабавіў. Можна хадзіць і з дзіркаю, але тады неабходна набыць спецыяльную манетніцу ці шматфункцыянальны кашалёк-партаманет.

### ГЭТАЯ ЖАБКА (СВІНКА) НАС НЕ ЗАДУШЫЦЬ

Цікава, а ці ёсць у нашых дзетак звычка збіраць кішэнныя грошы? Без манет такая звычка амаль не мае сэнсу. А тут з'яўляюцца новыя купюры і манеты. Па-першае, цяпер малым трэба даволі падрабязна расказаць аб дэнамінацыі, а таксама аб тым, што манета ў 1 рубель адпавядае сённяшнім 10 000, а новыя 10 капеек — гэта тысяча старымі. Калі дзеці самастойна наведваюць краму, то ім неабходна будзе даволі хутка навучыцца падлічваць свае фінансы па новай сістэме.

Асаблівa рукастых «кулібіных» спецыялісты Нацбанка папярэджваюць, што выкананне выявы манет можа рабіцца на любых матэрыяльных і нематэрыяльных носьбітах, за выключэннем сплаваў металаў. З пластмасы — калі ласка, можаце рабіць; пачаў капіраваць манету з металу — нажывеш непрыемнасці.

Калі гандаль і банкі будуць дакладна прытрымлівацца рэкамендацый Нацбанка і стануць выдаваць рэшту новымі купюрамі або манетамі, то даволі хутка металічныя грошы трапяць і ў рукі нашых дзетак. Таму я параіў бы набыць малым прыгожую скарбонку ў выглядзе свінкі ці жабкі. А апошняя няхай нас не задушыць, калі мы пачнём аддаваць металічную дробязь сваім дзеткам. А яшчэ варта пажадаць, каб гэтая самая дробязь мела пакупніцкую вагу. Сёння, заўтра і заўсёды.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ГАТОЎНАСЦЬ НУМАР АДЗІН

### Да 8 ліпеня Віцебск павінен быць цалкам гатовы да «Славянскага базару»

**Такое распараджэнне дала кіраўніцтву горада намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Наталля КАЧАНАВА ўчора на пасяджэнні аргкамітэта фестывалю.**

Яна засяродзіла ўвагу на тым, каб у фестывальнай зоне не было ніякіх рамонтаў дарог і камунікацый. «Зразумела, можа быць аварыйная сітуацыя — тады прыйдзецца працаваць. А каб яе не дапусціць, трэба зараз праверыць усе камунікацыі, абследаваць і прывесці ў парадак», — сказала Наталля Качанава.

Мэр Віцебска Віктар Нікалайкін запэўніў, што заўвагі мінулага года ўлічаныя: адрамантаваны і пафарбаваны фасады будынкаў па вуліцы Леніна, праспектах Фрунзе і Маскоўскім, а таксама паблізу зон адпачынку і каля вакзалаў. Дарожныя рамонты цэнтральных магістраляў таксама на стадыі завяршэння. У тым ліку часткова выкананы план пашырэння ўезду ў горад з боку Масквы і ад аэрапорта — да трох палос у абодва бакі. Таксама да фестывалю плануецца завяршыць рэканструкцыю падземнага пераходу на скрыжаванні Маскоўскага праспекта і вуліц Цераשковай і Броўкі — другога ў горадзе. Каля першага, які знаходзіцца побач з Летнім амфітэатрам, заканчваецца рамонт ніжняга ўзроўню, дзе размесцяцца білетныя касы і кафэ. Уведзена новая паркоўка прыкладна на 100 месцаў на вуліцы Хмяльніцкага, г.зн. паблізу асноўных фестывальных пляцовак. Абноўлена падсветка горада.

**Ул. інф.**

■ Педагагічны форум

## Каб не шукаць адказы ў канцы падручніка...

**Рэспубліканскі педагагічны савет, які адбудзецца ў апошнія дні жніўня, дасць старт новаму 2016/2017 навучальнаму году.**

Міністр адукацыі Міхаіл Журавкоў расказаў, што ён чакае ад форуму:

— Спадзяюся, што Рэспубліканскі педагагічны савет стане лагічным завяршэннем даволі доўгага актыўнага абмеркавання шматлікіх прапаноў па развіцці і ўдасканаленні сістэмы адукацыі нашай краіны. Безумоўна, галоўным вектарам развіцця павінна стаць павышэнне якасці адукацыі і ўніфікацыя ўсіх яе ступеняў. Якія ў якасці адукацыі складнікі? Што трэба зрабіць на дзяржаўным узроўні і якая роля кожнага з удзельнікаў адукацыйнага працэсу ў павышэнні якасці адукацыі? Якім павінен быць сучасны адукацыйны працэс ва ўніверсітэце? Пытанняў мноства і варыянтаў адказаў на іх не менш. На педагагічным форуме неабходна зацвердзіць узгодненае і адзінае рашэнне.

Па словах міністра адукацыі, адной з галоўных тэм савета павінна стаць таксама развіццё навукі і навуковага сегмента ў адукацыйным працэсе: «Для стварэння канкурэнтаздольнай эканомікі неабходныя веды, ініцыятыва і творчасць. Без крэатыўнага падыходу да вырашэння любой задачы з боку настаўніка, выкладчыка, навучэнца або студэнта мы так і будзем вырашаць задачы па шаблоне і шукаць адказ «у канцы падручніка».

Яшчэ адно важнае пытанне — актыўнае ўкараненне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у адукацыю. З аднаго боку, навучэнцы і студэнты даўно ўжо з імі «на ты», а вось ці гатовыя да гэтага настаўнікі і выкладчыкі? І, галоўнае, трэба зрабіць так, каб інфармацыйныя тэхналогіі працавалі на адукацыйны працэс, на якасць адукацыі, а не толькі запаўнялі нішу баўлення часу.

Не менш актуальная, на думку міністра, з'яўляецца і тэма прафарыентацыі навучэнцаў. «На жаль, чамусьці прынята лічыць, што гэта задача школы. Але хто павінен быць зацікаўлены ў тым, каб на прадпрыемства прыйшлі высокакваліфікаваныя і творчыя спецыялісты? У першую чаргу, кіраўнікі прадпрыемства ці арганізацыі. І на педагагічным савеце вельмі хацелася б знайсці той «залаты ключык», з дапамогай якога мы зможам прыцягнуць працадаўцаў да заняткаў з дзецьмі, да арганізацыі дапрафесійнай і прафесійнай падрыхтоўкі», — падкрэсліў Міхаіл Журавкоў.

Не застанецца па-за ўвагай і пытанне павышэння прэстыжу самой прафесіі педагога. «Слова «настаўнік» павінна прамаўляцца выключна з павагай. З іншага боку, немалаважны матэрыяльны аспект», — канстатуе кіраўнік галіны. — Перспектыўным напрамкам бачыцца фінансаванне школ, зыходзячы з нарматыўнага разліку затрат на аднаго навучэнца, а таксама ўвядзенне галіновай сістэмы аплаты працы. Гэта ў значнай ступені дазволіць палепшыць матэрыяльную базу школ і павысіць узровень заработнай платы педагогаў. Ці гатовыя рэгіёны да такога фінансавання? Як праходзіць эксперымент? Калі да яго падключыцца ўся краіна? Вось вам яшчэ цэлы блок пытанняў для абмеркавання».

Міністр адукацыі ўпэўнены, што многія грамадзяне Беларусі пажадаюць выказаць свае прапановы і даць парады па далейшым развіцці сістэмы адукацыі. На працягу ўсіх летніх месяцаў будзе праходзіць маніторынг прапаноў і пытанняў для абмеркавання іх на савеце.

Прапановы і пажаданні можна накіроўваць таксама на наступны электронны адрас: jvanina@minedu.unibel.by. Усе лісты абавязкова будуць разгледжаны пры падрыхтоўцы і абагульненні матэрыялаў да Рэспубліканскага педагагічнага савета.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ І мы там былі

# ПРАЗ ЦЕРНІ ДА ТЭЛЕЗОРАК

**Лёгка глядзець тэлевізійныя шоу з удзелам дзяцей, куды цяжэй — самому вырашаць, хто з іх больш ці менш таленавіты. Так здарылася, што мяне запрасілі быць у журы конкурсу-кастынгу «Юная тэлезорка», які праводзіўся ў рамках рэалізацыі праекта «Дзіцячая гадзіна на Беларусь 4».**



Раман Святцаў, Яна Рагалевіч, Максім Варачкін.

## Першыя ўрокі тэлемайстэрства

Да справы прафесіяналы ТРК «Гомель» падышлі грунтоўна. З лютага па раёнах спецыялісты ўпраўлення адукацыі праводзілі адборы школьнікаў для ўдзелу ў паўфінале. Месяц таму вызначылі 23 самых-самых тэлегенічных, артыстычных, пластычных, харызматычных, абаяльных...

На працягу апошніх тыдняў з імі працавалі непасрэдна на тэлебачанні. Дзеці паспрабавалі сябе ў ролі карэспандэнтаў і дыктараў. Пры дапамозе прафесіяналаў рэгіянальнага тэлебачання яны ўдзельнічалі ў стварэнні тэлесюжэтаў, праводзілі апытанні на вуліцах горада, агучвалі тэкст за кадрам... Такім чынам набывалі невядомы да гэтага часу вопыт тэлемайстэрства. Ну, а дарослыя сачылі, наколькі арганічна атрымліваецца ў кожнага ствараць «стравы» на тэлекухні.

Журналіст Аляксандр Гамоля расказвае, што яго асабіста здзівіла, наколькі падрыхтаванымі аказаліся ўдзельнікі, якія прыехалі ў Гомель з глыбінкі:

— Нам яны сябе дэманстравалі ў самых розных жанрах: былі і танцоры, і музыканты, і спевакі. Але ж для нас самае галоўнае — як яны ўмеюць размаўляць. Чалавек, які становіцца ў кадр, павінен адчуваць камеру і гледача, мець сваю харызму. Шчыра здзівіла, што тыя, хто прыехаў з глыбінкі, маюць чыстае маўленне і добрую дыкцыю. Нам было цікава адзначыць жывое мысленне: калі дзіця непасрэдна рэагуе і можа адразу ж нестандартна сфармуляваць свае думкі.

Самі дзеці вельмі адказна паставіліся да здымак. Сваёй нястомнай энергіяй многія «заводзілі» не толькі аператараў і рэжысёраў, але і прахожых на вуліцах, да якіх «прыставалі» з мікрафонам і няпростымі пытаннямі. Напрыклад, пра адносіны да дэнамінацыі. Ступар у дарослых праходзіў, яны пачыналі ўсміхацца і потым і сур'ёзна адказваць на пытанні журналістаў метровага росту. Рост праз год-два павялічыцца, вопыт і стасункі застануцца і яшчэ абавязкова спатрэбяцца, лічыць Дар'я Петракова са Светлагорска:

— Мы не чакалі, што наша светлагорская каманда ў поўным складзе выйдзе ў паўфінал. Вельмі здзівілася. Маёй асабістай радасці не было мяжы. Калі я апынулася ў ролі тэлевядучай, зразумела, што гэта нашмат больш складана, чым здаецца. Спачатку не ведала, як паводзіць сябе ў кадры, куды глядзець, дзе камера, дзе суфлёр. Вельмі хвалявалася. Столькі эмоцый, словамі не перадаць!

## Як трапіць «у дзясятку»

Настойлівасці ў гэтых дзяцей больш чым дастаткова. Асобныя прайшлі ўжо праз розныя конкурсы і маюць пэўны вопыт. Для кагосьці ён спатрэбіўся, камусьці стаў перашкодай, бо патрабаванні ўсюды розныя і трапіць «у дзясятку» было вельмі складана. Цяжка спадабацца ўсім членам журы адразу. Кожны меў свой, часам вельмі суб'ектыўны погляд. Ва ўсіх «суддзяў» прыхільнасці былі сапраўды розныя, але ж некаторыя юныя асобы сабралі большасць галасоў. Таму ўрэшце справу вырашалі балы, пастаўленыя на працягу конкурснай праграмы. Хтосьці выбар рабіў на ўзроўні інтуіцыі, хтосьці, як дырэктар Дырэкцыі тэлеканала «Беларусь 3» Віктар Маючы, сыходзячы з вялікага вопыту ў правядзенні падобных мерапрыемстваў:

— Я не люблю слова «тэлезорка». На мой погляд, гэта яшчэ адна магчымасць творчай рэалізацыі. І сэнс неабавязкова, што фіналісты ўрэшце стануць тэлезоркамі. Гадоў 15 таму існаваў рэспубліканскі конкурс «Сузор'е надзей», які таксама праводзіўся пры дапамозе сістэмы адукацыі. Прыемна, што адраджаецца колішняя традыцыя. Сёння Гомельскае абласное ўпраўленне адукацыі мае магчымасць арганізаваць такі конкурс, а абласны рэгіянальны тэлеканал — зрабіць яго тэлевізійную версію. Ёсць паступальны рух наперад і юныя зоркі маюць шанц заваяваць сваіх гледачоў.

Дзесяцігадовы Уладзіслаў Крупа прыехаў на конкурс з Петрыкава. Блакітнавокі хлопчык зусім не верыў, што будзе заўважаны. Нават у сваёй візітоўцы напісаў: «У цябе няма шанцаў — гучна заявілі абставіны. Ты няўдачнік — сказалі сябры». Але дадаў: «У цябе ўсё атрымаецца — ціха сказаў Бог». У яго сапраўды атрымалася. Прыз глядзельнай залы — безумоўная ўзнагарода.

Прыгожай і артыстычнай Сюзане Чваньковай з Калаюбіч Гомельскага раёна дастаўся спецпрыз ад партнёра конкурсу — Гомельскай галерэі Гаўрыіла Вашчанкі. Спецыяльныя прызы арганізатараў конкурсу паехалі ў невялічкі Ельск: Аліна Чарняк і Віктар Дашкевіч пакарылі ўменнем працаваць у пары. Спецпрыз журы конкурсу дастаўся 12-гадоваму Максіму Тафеенку. Ён змог заваяваць прыхільнасць строгіх суддзяў сваёй пластычнасцю, шчырасцю, непасрэднасцю і схільнасцю да імправізацыі. Прызнаюся, што юны мазыранін і мяне асабіста скарыў сваёй абаяльнасцю:

— Самае цікавае было, калі я супакойваў бабулю, якая патэлефанавала мне ў студыю. Шкада, што сюжэт вельмі абрэзалі.

Журналіст Святлана Князева, якая непасрэдна працавала са школьнікамі, сведчыць, што людзі на вуліцы вельмі эмацыянальна рэагавалі, калі да іх падбягалі і задавалі пытанні дзеці.

У малодшай групе міс і містарам тэлеканала «Беларусь-4. Гомель» пасля доўгага абмеркавання названы Вераніка Сцяпанава са Светлагорска і Дзмітрый Капуза з Рэчыцы. Гэтым дзецям мне асабіста даваліся ўручаць галоўныя прызы. Эмацыянальны Дзіма не вытрымаў, пры ўзнагароджванні ў яго на вачах навярнуліся слёзы... Яго бацька Аляксандр у рэчыцкай музычнай школе вучыць дзяцей іграць на балалайцы і гітары. Таму артыстычнасць можна лічыць сямейнай традыцыяй. Тата кажа, што спадзяваўся і чакаў убачыць сына сярод пераможцаў. Для самога Дзімы тэлеконкурс — важнае выпрабаванне:

— Самае складанае было, калі сядзіш, глядзіш на манітор тэлесуфлёра, а тэкст занадта хутка прабег, і ты не паспеў яго прачытаць. Можна лёгка запнуцца.

Адзінаццацігадовая Вераніка Сцяпанава не спадзявалася на перамогу. Яна загадзя лічыла самым важным вопыт, які набываецца ў такіх конкурсах:

— Я разумела, што трэба заўсёды ўсміхацца, не баяцца і даваць поўныя адказы на пытанні журы. Я паспрабавала сябе ў ролі карэспандэнта. Мы рабілі разам сюжэт пра гомельскую вежу для агляду наваколля. Безумоўна, крыху хвалявалася і часам забывала тэкст, але ўрэшце ўсё атрымалася добра.

У старэйшай групе міс і містарам тэлеканала «Беларусь-4. Гомель» сталі Ганна Гаўрылавец з вёскі Чырвонабярэжжа Лельчыцкага раёна і жыхар Рэчыцы Раман Святцаў. 15-гадовы хлопчык да гэтага часу схіляўся да прафесіі медыка, але конкурс, магчыма, можа паўплываць на будучы выбар. Дарэчы, юнак вельмі крытычны да таго, што робіць:

— Вынік нечаканы. Здаецца, у мяне было шмат памылак, і я дагэтуль не магу паверыць, што пераможца. Цяпер буду марыць стаць сапраўдным тэлевядучым.

Маці Рамана Ганна Анатолеўна чакала, што сын выйдзе ў лідары:

— Калі чалавек робіць нешта з задавальненнем, гэта адразу відаць. Для мяне галоўнае не тое, каб ён стаў тэлезоркай, а каб сын атрымліваў задавальненне ад усяго, чым займаецца.

Больш, чым іншыя, сваёй перамозе была здзіўлена сціплая Ганна Гаўрылавец з самага аддаленага раёна Гомельшчыны — Лельчыцкага. Вясковая дзяўчынка са шматдзетнай сям'і тым не менш з'яўляецца алімпіядніцай па беларускай мове, і для яе не былі складанымі пытанні, зададзеныя па-беларуску:

— Прызнацца, ніколі не думала, што змагу перамагчы. Я пра сябе ўвогуле гаварыць не ўмею. Я хацела быць то журналістам, то эканамістам... Пакуль нават не ведаю, да чаго больш душа імкнецца. Калі мы працавалі на студыі, я больш за ўсё перажывала за свайго партнёра Дзіму Капузу, а за сябе не перажывала ўвогуле. Але пакуль для мяне складана «трымаць твар», усміхацца заўсёды...

## Дэманструем вопыт у кадры

Дарэчы, на працягу ўсяго часу правядзення конкурсу Тэлерадыёкампанія «Гомель» кожны тыдзень у праграме «Добры вечар, Гомель» змяшчала сюжэты з інфармацыяй пра кастынг у раёнах, інтэрв'ю з удзельнікамі, падрыхтоўку фіналістаў на тэлебачанні, майстар-класы для фіналістаў. Хутка ў эфір выйдзе і тэлеверсія фіналу на канале «Беларусь-4. Гомель». Не за гарамі і падвядзенне вынікаў галасавання ў інтэрнэце на сайце http://tvrgomel.by/, якое вызначыць найбольш папулярных удзельнікаў сярод гледачоў. А потым пачнецца галоўнае: карпатлівае стварэнне дзіцячай праграмы, вядучымі якой стануць хлопчыкі і дзяўчынкі, якіх заўважылі прафесіяналы тэлебачання. Дырэктар ТРК «Гомель» Святлана Яўрасава адзначае, што для патэнцыяльнага тэлевядучага важна мець шчырую інтанацыю, якая прымусіць гледача яму паверыць:

— Ва ўсіх тэлеперадачах галоўныя не вядучыя, а людзі, якія прыходзяць у госці. Тыя, пра каго мы здымаем свае праграмы. Пры гэтым ад вядучага насамрэч вельмі многае залежыць. Таму важна абаянне, натуральнасць, а для дзяцей — яшчэ і непасрэднасць. Наш конкурс паказаў, якія цудоўныя ў нас дзеці, якія яны творчыя і мэтанакіраваныя. Упэўнена, што кожны з іх знойдзе сваю нішу ў гэтым жыцці і зможа рэалізаваць усе свае таленты.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

■ Любімыя фільмы

# ВАЕННАЕ КІНО, ПАРАД І ВІНШАВАННІ ДА СВЯТА

**Да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь тэле- і радыёканалы Белтэлерадыёкампаніі рыхтуюць для сваіх гледачоў прамыя трансляцыі асноўных урачыстых мерапрыемстваў, тэматычны паказ мастацкіх, дакументальных фільмаў і канцэртныя праграмы. Па добрай традыцыі кожны тэлеканал упрыгожыць святочныя лагатыпы.**

У эфіры «Беларусь 1» і «Беларусь 24» 2 ліпеня будуць паказаны ўрачысты сход і святочны канцэрт майстроў мастацтваў «Беларусь — імя святое», прысвечаны Дню Незалежнасці, а на наступны дзень у 10.55 тут пачнецца прамая трансляцыя парада войскаў Мінскага гарнізона «Са святам, любая Айчына!».

Спецыяльна ў Дзень Незалежнасці на «Беларусь 1» выйдзе заключная восьмая серыя мастацка-публіцыстычнага цыкла фільмаў «Гумар на вайне» (першы выпуск гледачам быў прадстаўлены 9 мая). Праект уяўляе сабой мюзікл, складзены з сатырычных песень, жартаў і кур'ёзных сітуацый, якія здараліся на вайне і ўздымалі баявы дух салдат. Не абыдзецца на «першай кнопцы» і без тэматычных кінапаказаў. Для прагляду прапануюцца: драма «Брэсцкая крэпасць», лірычная камедыя «Белыя росы», ваенны баявік «Смерш».

Тэлеканал «Беларусь 2» 3 ліпеня ў ранішнім эфіры пакажа хранікальна-дакументальны фільм з цыкла «Партызаны». Потым ваенную тэму працягне драма «Аляксандр маленькі», у аснову якой пакладзены сапраўдны факт аб савецкіх салдатах, што арганізавалі ў 1945 годзе на вызваленай тэрыторыі Германіі дзіцячы дом. Таксама зможам убачыць кінакарціну з залатога фонду савецкай кінакласікі — «Жэня, Жэнечка і «кацюша». У вячэрнім эфіры — знакамітая кінааповесць «А досвіткі тут ціхія».

На «Беларусь 3» вас чакае «Беларускі канцэрт», дзе будуць прадстаўлены эксклюзіўныя гістарычныя кадры з выступленнямі лепшых беларускіх артыстаў у суправаджэнні Дзяржаўнай харавой капэлы пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Рыгора Шырмы, знятым кінастудыяй «Беларусьфільм» у 1955 годзе. Таксама ў эфіры тэлеканала зможам убачыць чарговую экспедыцыю праекта «Наперад у мінулае» і пачуць лепшыя аранжыроўкі песень у хіт-парадзе «Сто песень для Беларусі».

Тэматычны эфір, прымеркаваны да Дня Незалежнасці, таксама прадстаўлены на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё. У вячэрнім эфіры 1 ліпеня тут пачуецца шырокае асвятленне ўрачыстага сходу і святочнага канцэрта майстроў мастацтваў Беларусі. У праграме «Адкрытая пляцоўка» і выпусках «Навін» даведаемся пра акцыю «Дзень вышыванкі». Не абыдзецца і без тэматычнага радыёдня 3 ліпеня. Выйдзе святочны выпуск публіцыстычнай праграмы «Беларусь — найноўшая гісторыя». Акрамя таго, павялічыцца колькасць інтэрактыўных віншавальных праграм, дзе ў слухачоў Першага нацыянальнага канала будзе больш магчымасцяў накіраваць адно аднаму святочныя прывітанні.

**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*


# «НАМ З ВАМІ ПА ДАРОЗЕ»

**КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»**

**на III квартал або II паўгоддзе 2016 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце**
**ДА 13 ЛІПЕНЯ 2016 ГОДА**
**ў рэдакцыю на адрас:**
**вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.**







Сярод падпісчыкаў 14.07.2016 года будуць разыграны 7 двухмесных палатак Atemi і суперпрыз — веласіпед Stels Navigator 700 V 2016. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 24.07.2016 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30.09.2016 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2016 года і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Нам з вамі па дарозе» чытайце ў нумары 103 газеты «Звязда» ад 02.06.2016 года.

**Тэлефон для даведак (017) 284 44 04.**

**ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 07.06.2016 ПА 30.09.2016 ГОДА.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2768 ад 26.05.2016 года, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2016 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________

____________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________
(аддзяленне сувязі)
____________ на III кв. або 2-е паўг. 2016 года

Хатні адрас і тэлефон ________ (індэкс)
(абавязкова)
____________

____________

Удачы ў розыгрышы!




# У АСЕЦІ СНОП КАЛЯНДРЫ

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Буякі́** — ягадная расліна сямейства брусні́чных. *«Кусцікі буякоў і багунніку»*, — чытаем у Анатоля Кудраўца. *Расіяне скажуць: голубика.*

**Буса́к** — жэрдка з металічным вастрыём і крукам на канцы. *Бусак — гэта той самы багор.*

**Але́шнік** — зараснік альховых кустоў, альховы лес. *«Густы алешнік і месцамі лаза зялёнай сцяной аплялі азёрныя берагі з усіх бакоў»,* чытаем у Платона Галавача.

**Асе́ць** — памяшканне пры гумне для сушкі снапоў. *На Беларусі асець шырока існавала да пачатку ХХ стагоддзя.*

**Каля́ндра** — расліна, якая выкарыстоўваецца як прыправа. *Слова прыйшло да нас з лацінскай мовы. У рускай мове гэта «кориандр».*

**Крысо** — ніжняя частка адзежыны, палавіны якой спераду расхінаюцца. *«Ляснік адхінуў крысо свайго кажуха, выняў акуляры»*, — чытаем у Алеся Пальчэўскага. *Крысо — тая самая пала́.*

**Дзірка ад абаранка** — зусім нічога. *Беларускія адпаведнікі: ні шыша, ні чорта, ні халеры, нічагусечкі. Руския: дырка от бублика, ничегошеньки.*

**Рабіць пагоду** — выконваць самую істотную ролю ў нечым, мецць вырашальную ролю. *Беларусы яшчэ скажуць: весці рэй, задаваць тон, іграць першую скрыпку. Руския: командовать парадом. Словы «пагода» і «надвор'е» ў звычайным ужыванні раўназначныя. Выраз звязаны з дзейнасцю астролагаў, якіх трымалі раней пры французскім каралеўскім двары, бо яны нібыта не толькі прадказвалі пагоду, але і маглі на яе ўплываць.*

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Адбор

# ТАЛЕНТ НА МАЛЬТУ ПРЫВЯДЗЕ

**Склад удзельнікаў фіналу Нацыянальнага адборачнага тура дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2016» стаў вядомы 27 чэрвеня. Дзясятку фіналістаў па выніках праслухоўвання выбрала прафесійнае журы.**

Арганізатары дапусцілі ўсіх прэтэндэнтаў, чые заяўкі былі афармлены ў адпаведнасці з патрабаваннямі. У выніку пачулі 45 удзельнікаў, сярод якіх 39 сольных выканаўцаў і 6 вакальных гуртоў. Кожны з прэтэндэнтаў прадставіў сваю творчасць у студыі гуказапісу Белтэлерадыёкампаніі ў рэжыме жывога гуку і ў суправаджэнні музыкі і (ці) фанаграмы, запісанай без вакалу.

У фінале адборачнага тура мы на гэты раз убачым і пачуем наступных юных артыстаў: Аляксандра Міненку, Юлію Мажылоўскую, Стэфанію Сакалову, Зінаіду Купрыяновіч, Марыю Жыліну і гурт «Нясумны ўзрост» з Мінска, Марыю Магільную, Алену Цітову і Вольгу Канавалаву з Магілёва, а таксама шоу-групу «So-Ni-Ka» з Віцебска.

Фінальнае шоу ў форме гала-канцэрта адбудзецца ў прамым эфіры тэлеканалаў «Беларусь 1» і «Беларусь 24» не пазней за 16 верасня. Па традыцыі эксклюзіўным вяшчальнікам як Нацыянальнага адбору, так і міжнароднага дзіцячага конкурсу песні выступае тэлеканал «Беларусь 1».

**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*

## Панядзелак, 4 ліпеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.25** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20 Серыял «Грачанка».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.10, 13.15 Камедыя «Шукаю жонку з дзіцем». 1—4-я серыі.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.15 Серыял «Жыць спачатку».**
**16.35 Серыял «Сваты-4».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00** Форум з Дзмітрыем Бачковым.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «След».**
**0.00** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 10.15, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05** «Здзіві мяне». Талент-шоу.
**10.50** Азбука густу.
**11.20 Драма «Вецер вандраванняў».**
**12.55** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**13.55 Дэтэктыў «Лэдзі знікаюць апоўначы».**
**17.55 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**19.15** Суперлато.
**20.05** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.
**21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**22.00** КЕНО.
**22.05** Рэпарцёр.
**23.00 Серыял «Бівер Фолс».**

### Беларусь 3

**8.00, 13.15, 18.25, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.15, 18.40, 21.15** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**8.20 «Людзі на балоце». Кінаэпапея.**
**10.50** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**11.40** «Наперад у мінулае».
**12.10 «Госця з будучыні». Прыгоды. 1-я серыя.**
**13.25** Творчы вечар народнага артыста СССР Расціслава Янкоўскага.
**14.25, 21.50** «Час кіно».
**14.35 «Бывай, Гульсары!» Драма.**
**16.15 «Галоўны канструктар». Драма.**
**18.45** «Загадкі рускай гісторыі». «Святаполк — рускі Гамлет». «Святаполк Акаянны. Жыццё за ўладу». Дак. фільм.
**19.40 «Архіў смерці». Драма. 1-я серыя.**



**20.40** «Калыханка».
**22.00 «Вясновыя навальніцы». Драма.**
**23.30** «Геапалітыка: свет за тыдзень».
**На тэлеканале «Беларусь 3» па Брэсцкай, Гомельскай і Гродзенскай абласцях з 4 па 8 ліпеня 2016 г. будуць транслявацца абласныя тэлепраграмы:** *панядзелак аўторак, серада, чацвер і пятніца — з 18.40 па 19.40.*

### Беларусь 5

**7.50, 18.50** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Пляжны футбол. Еўраліга. Беларусь — Іспанія.
**9.15** Пляжны футбол. Еўраліга. Беларусь — Грэцыя.
**10.30** Мастацкая гімнастыка. Кубак свету. Берлін.
**13.05** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. 1/4 фіналу.
**15.00, 22.10** Тэніс. Уімблдон.
**18.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Агляд гульнявога дня.
**18.55** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» Салігорск — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна).
**20.55** PRO спорт. Вынікі.
**21.25** Час футбола.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здорава!»
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Гэта Я».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Адваротны адлік». «Партызанскі рубеж. Вайна пасля параду».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15** «Беларусь без межаў з гуртам «Без Билета».
**23.00 Трылер «Сведка».**
**0.45** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.25** «Вялікае снеданне».
**10.05** «Далёкія сваякі».
**10.40 Маст. фільм «Дзяржаўная мяжа. Смяротны ўлоў».**
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Наша справа».
**14.05** «Участак лейтэнанта Качуры». «Сеткавая пагроза».
**15.55** «Часткі свету».
**16.50** «Вялікі горад».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Ваенная тайна».
**23.00** «Тайны Чапман».
**23.50 Серыял «Водбліскі».**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Беларусь сёння».
**9.30 Серыял «Марскі патруль», 1—3 серыі.**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Маст. фільм «Як тры мушкецёры».**
**15.30** «Трымайся, шоубіз!»
**16.20, 2.45** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**16.50, 3.10** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20 Серыял «Невідзімкі».**
**19.20 Серыял «Сінія ночы».**
**22.00 Маст. фільм «Пах верасу».**
**23.50** Ток-шоу «Слова за слова».
**0.40 Маст. фільм «Шчыт Айчыны».**
**2.15** Дак. серыял «Іншы свет».
**3.40 Маст. фільм «У пошуках радасці».**
**5.25** «Зроблена ў СССР».

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** Ток-шоу «Што адбываецца».
**12.40** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Тайны следства».**
**19.10, 20.50 Серыял «Лёсу загадкавае заўтра».**
**21.55, 23.10 Серыял «Шаманка».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**9.00** «Люстэрка для героя».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.20, 22.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Урачэбныя тайны плюс».
**14.15** «Ты не паверыш!»
**15.05, 16.20 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**19.40 Серыял «Бачу — ведаю».**
**22.35** «Вынікі дня».
**23.05 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы».**

### 8 канал

**7.00, 14.25, 19.25, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** «Мультпарад».
**7.30 Серыял «Чорны спіс».**
**8.15 Трылер «За мяжой».**
**10.00 Серыял «Пад купалам».**
**10.45 Трылер «Горад зладзеяў».**
**12.55 Серыял «Каўчэг».**
**14.15, 18.15, 19.15, 21.00** «Хатняя крама».
**14.30 Серыял «Нашчадкі».**
**16.20** «Кінаблакнот».
**16.30** «Золата маўчання».
**16.50 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**18.25 Серыял «Абацтва Даўнтан».**
**19.30 Серыял «Уцёкі».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Свой фермер. Дзённік».
**21.20 Баявік «Аграбленне па-італьянску».**
**23.05 Серыял «Спартак».**

### ВТБ

**6.00, 23.15, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30, 17.30, 0.00, 3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Кахае не кахае».
**9.30, 14.00, 19.00** Серыял «Анжаліка».
**10.30** «Кіно ў дэталях».
**11.30** Трылер «Саўдзельнік».
**15.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.00** «Лаві момант».
**20.00** Серыял «Як я стаў рускім».
**21.10** Камедыя «Каханне з акцэнтам».
**23.30, 4.00** «Уральскія пельмені».
**0.30, 3.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».

### Культура

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.40** «Назіральнік».
**11.15** «Рамантыкі». Маст. фільм.
**12.25, 23.50** «Следства вядуць знатакі». Тэлефільм. 1-я серыя.
**14.10** «Навекі з небам». Дак. фільм.
**15.10** «Надзея Кашаверава. Казачнае жыццё». Дак. фільм.
**15.50** «Цень». Маст. фільм.
**17.20** «Залатое стагоддзе музыкі кіно». Дак. фільм.
**18.15, 20.30, 2.40** Сусветныя скарбы.
**18.35** Да 80-годдзя рэжысёра Андрэя Тарсценсена. «Аліса Коанен». Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** «Пётр Алейнікаў. Няправільны герой». Дак. фільм.
**20.45** «Сага аб Фарсайтах». Серыял. 1-я серыя.
**21.35** Жыццё цудоўных ідэй. «Чорныя дзіркі».
**22.05** «Кінескоп». 38-ы Маскоўскі міжнародны кінафестываль.
**22.45** «Холад». Дак. серыял. 1-я серыя.
**23.45** Мастсавет.
**1.30** «Роберт Бёрнс». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Народжаныя ў СССР». Лепшае. Э. Хіль, В. Крутаў, М. Мінкоў. 2012 год.
**6.55, 8.40, 11.40, 12.55, 15.35, 17.35, 18.55, 20.35, 21.40, 23.00, 1.20, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.20** «Зямля—Паветра». Гурт «Смысловые галлюцинации». 2003 год.
**9.00** «Быў час». 2009 год.
**10.00** Маст. фільм «Дрэнны добры чалавек».
**12.00** «Трыбунал». Канцэрт Наталлі Мядзведзевай. 1995 год.
**15.00** «Іосіф Бродскі. Паэт пра паэтаў». 1992 год.
**16.00** Маст. фільм «Школьны вальс».
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Led Zeppelin». 2004 год.
**19.15** Маст. фільм «Прахіндзіяда, або Бег на месцы».
**20.50** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!» 1975 год.
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**22.00** «Народжаныя ў СССР».
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1959. 2-я частка. 2009 год.
**1.15** Дак. фільм «Навіны дня. Хроніка нашых дзён».
**1.40** Маст. фільм «Начны госць».
**4.00** «Колба часу».

### EuroSport 1

**5.30, 12.30, 18.45** Лёгкая атлетыка.
**6.30, 10.40, 14.00, 15.15, 1.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс».
**8.00** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір.
**9.30, 11.10, 12.20, 13.50** Футбол. «Фанаты Еўра».
**9.40, 22.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс» з Грэгам Лемондам.
**11.20** Конны спорт.
**15.00, 18.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс»-экстра.
**20.00, 0.30** «Дарога да золата».
**20.30** «Спорт знутры».
**21.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**23.30** Веласпорт. Тур Аўстрыі.
**0.00** «Найлепшае з коннага спорту».
**0.15** Watts.
**2.30** Лёгкая атлетыка. Гульні Паава Нурмі.

### Камедыя

**1.25** Меладрама «Сняданак у ложак».
**3.20** Камедыя «Адзінокі па кантракце».
**5.20** Камедыя «Уніз па лесвіцы».
**7.10** Камедыя «Два ў адным».
**8.50** Камедыя «Паліцэйская гісторыя».
**10.35** Камедыя «Паліцэйская гісторыя 2».
**12.45** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**14.00, 14.50, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Востраў скарбаў».
**17.50** Камедыя «Старыя разбойнікі».
**19.30** Камедыя «Вясёлыя і загарэлыя».
**21.15** Камедыя «Шалёныя грошы».
**23.00** Камедыя «І не чырванее».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**6.50** «Доктар І...»
**7.20, 18.55, 1.55** «Курт Сеіт і Александра». Серыял.
**9.15, 3.35** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.15, 4.20** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.20** «У майго дзіцяці шостае пачуццё».
**12.20** «Без падману».
**13.10** «Кандагар». Драма.
**15.00** «Каменская». Серыял.
**15.55** «Паненка-сялянка».
**16.55** «Смерць на здымачнай пляцоўцы». Дак. фільм.
**17.50** «Другое дыханне». Серыял.
**21.05, 1.10** «Ежа, я люблю цябе».
**21.55** «Рэвізора».
**22.55** «Развітанне».
**23.40** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**5.10** «Часова даступны».

### ТБ1000

**6.10, 18.15** Фантастыка «Чорная дзірка».
**8.10, 4.10** Меладрама «Версальскі раман».
**10.10, 2.25** Фільм — дзецям «Апошняя Мімзі Сусвету».
**11.50** Драма «Падмена».
**14.20** Камедыя «Тату зноў 17».
**16.10** Камедыя «Закаханы Шэкспір».
**20.10** Прыгоды «Там, дзе жывуць пачвары».
**22.10** Драма «Рамэа і Джульета».
**0.15** Трылер «Нічога асабістага».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.20** Меладрама «Дзённік яго жонкі».
**8.30, 2.50** Камедыя «Хлопец з нашых могілак».
**10.20, 4.40** Камедыя «Палярны рэйс».
**12.20** Трагікамедыя «Мастацтва жыць у Адэсе».
**14.20** Меладрама «Аднойчы».
**16.20** Камедыя «Ч/Б».
**20.20** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... бацька нявесты».
**22.10** Драма «Жыць».
**23.35** Меладрама «Прасвятленне».
**1.20** Камедыя «Сірата казанская».

### National Geographic

**6.00, 18.40** Супербудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 16.55, 22.45** Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога.
**7.40, 17.55, 21.45, 2.05, 5.10** Сапраўдны геній.
**8.40, 13.30, 19.30** Місія па выратаванні тыграў.
**9.40, 14.20, 20.20** Сучасныя расследаванні.
**10.25** Па слядах міфічных пачвараў.
**11.10** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**12.00** Незвычайныя промыслы.
**12.40** Навуковыя недарэчнасці.
**15.05** Каралі шахт.
**16.10** Інстынкт выжывання.
**21.05, 1.15, 4.25** Навука будучыні.
**23.40, 2.50** Уварванне на Зямлю.
**0.30, 3.40** Расследаванні авіякатастроф.

### Discovery

**8.00** Бягом па Брытаніі.
**9.00, 14.00, 19.30** Як гэта ўстроена?
**9.30, 14.30, 19.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 17.00, 0.00** Паляўнічыя на склады.
**11.00** Дзікая кухня.
**12.00** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**13.00** Паездка ўлегцы.
**15.00, 7.10** Хуткія і гучныя.
**16.00, 5.30** Махінатары.
**18.00** У пошуках скарбаў.
**20.00, 3.50** Голыя і напалоханыя.
**21.00, 2.00** Выжыць разам.
**22.00, 2.55** Рачныя монстры.
**23.00** Паляўнічыя на рачныя дыяменты.
**0.30** Бітвы за кантэйнеры.
**1.00** Склады.
**1.30** Паляўнічыя на рэліквіі.
**4.40** Маланкавыя катастрофы.
**5.05** Сапраўдныя аферысты.
**6.20** Багажныя войны.

## Серада, 6 ліпеня

### Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.00** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00 Серыял «Грачанка».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Простае жыццё». 1-я серыя.**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20, 0.15** Сфера інтарэсаў.
**21.20** Панарама.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Паўфінал.
**0.50** Дзень спорту.
**1.05 Серыял «Дзявочае паляванне».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 21.10** «Бітва экстрасэнсаў. Вайна тытанаў».
**11.20, 17.45 Серыял «Мая цудоўная няняка».**
**12.35, 18.55 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**13.30, 19.55 Серыял «Кухня».**



**14.40** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.15 Трылер «Закрытая школа».**
**17.15** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.05 Серыял «Бівер Фолс».**

### Беларусь 3

**8.00, 12.25, 18.25, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.15, 12.45, 18.40** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**8.20, 17.00 «Нестар Бурма». Серыял.**
**9.50, 19.40 «Архіў смерці». Драма.**
**10.45** «Святло далёкай зоркі». Памяці паэтэсы Любові Шэлег.
**11.15 «Госця з будучыні». Прыгоды.**
**12.15** М/ф.
**12.50** «Роднае слова». Паэт Янка Лучына.
**13.20** Канцэрт гурта «Стары Ольса».
**14.25 «За што?» Драма.**
**18.45, 21.15** «Аперацыя «Баграцён». Хроніка Перамогі». «Чарная ружа адквітнела». «Каны на Бярэзіне». Дак. фільмы.
**20.40** «Калыханка».
**22.10 «Паўлінка». Фільм-спектакль.**
**23.25** «Янка Купала. ...Я адплаціў народу». Дак. фільм.
**23.55 «Купальская ноч». Камедыя.**

### Беларусь 5

**7.15, 18.00, 23.05** PRO спорт. Навіны.
**7.25** Спорт-кадр.
**7.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. 1/4 фіналу.
**9.50** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. 1/4 фіналу.
**11.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Ранішняя сесія.
**14.40** Козел пра футбол.
**15.00, 21.05, 23.15** Тэніс. Уімблдон.
**18.05** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Вячэрняя сесія.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Гэта Я».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Практыка».**
**22.50** «Вызваленая Еўропа».
**23.40 Маст. фільм «Мільён для чайнікаў».**



**1.25** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.00** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Тэрыторыя памылак».
**15.30** «Вадзіць па-руску».
**16.10** «Аўтапанарама».
**16.50 Серыял «Следакі».**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**22.00** «Глядзець усім!».
**23.55 Серыял «Водбліскі».**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Медыцынская праўда».
**9.30 Маст. фільм «Зімняя вішня».**
**11.10 Маст. фільм «Мужчына ў доме».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Серыял «Сінія ночы».**
**16.20, 2.25** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**16.50, 3.20** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20 Серыял «Невідзімкі».**
**19.25 Серыял «Так склалися зоркі», 1—2 серыі.**
**21.30 Маст. фільм «Сэрца маё — Астана».**
**23.40** Ток-шоу «Слова за слова».
**0.30 Маст. фільм «Салёны сабака».**
**1.55** Дак. серыял «Іншы свет».
**3.40 Маст. фільм «Член урада».**
**5.30** «Зроблена ў СССР».

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.30** «Хто першы? Хронікі навуковага плагіяту». «Прыгоды цела. Выпрабаванне апусканнем».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Тайны следства».**
**19.10, 20.50 Серыял «Лёсу загадкавае заўтра».**
**21.55, 23.10 Серыял «Шаманка».**
**23.45** «Спецыяльны карэспандэнт».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**9.00** «Люстэрка для героя».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.20, 22.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Урачэбныя тайны плюс».
**14.15 Серыял «Ціхае паляванне».**
**15.05, 16.20 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**19.40 Серыял «Бачу — веданы».**
**22.35** «Выніі дня».
**23.05 Серыял «Марскія д'ябли. Смерч. Лёсы».**

### 8 канал

**7.00, 14.25, 19.30, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** «Мультпарад».
**7.30, 19.35 Серыял «Уцёкі».**
**9.00, 18.05 Серыял «Абацтва Даўнтан».**
**9.50 Серыял «Гудзіні».**
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Меладрама «Адзін дзень».**
**12.45** «Кінаблакнот».
**13.00 Серыял «Каўчэг».**
**14.20, 15.55, 18.00, 19.25, 20.55** «Хатняя крама».
**14.30 Серыял «Нашчадкі».**
**16.25** «Свой фермер. Другі сезон».
**16.45 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**18.55** «Мой любімы гадаванец».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Асада».**
**23.00 Серыял «Спартак».**

### ВТБ

**6.00, 17.00, 4.00** «Лаві момант».
**6.30, 23.05, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 13.30** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Кахае не кахае».
**9.30, 14.00, 19.00** Серыял «Анжаліка».
**10.30, 15.00, 20.00** Серыял «Як я стаў рускім».
**11.30** Меладрама «Ракавая красуня».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.30, 23.30, 3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**21.10** Камедыя «Вясельная вечарынка».
**0.00** Еўрапейскі покерны турнір.
**0.50, 3.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 20.45** «Сага аб Фарсайтах». Серыял.
**12.10** «Праўінцыяльныя музеі Расіі». Звянігарад.
**12.40, 23.50** «Следства вядуць знатакі». Тэлефільм.
**14.05, 1.15** «Георгій Менглет. Лёгкі талент». Дак. фільм.
**14.45** Жывое дрэва рамёстваў. Фядоскіна.
**15.10** «Малюючы словы». Дак. серыял.
**15.40, 20.30** Сусветныя скарбы.
**15.55** «Кінескоп». 38-ы Маскоўскі міжнародны кінафестываль.
**16.35, 22.45** «Холад». Дак. серыял.
**17.20** «Фестывалю ў Вярбʼе — 20!» Гала-канцэрт. Частка 1-я.
**18.25** «80 гадоў рэжысёру Андрэю Тарсценсену». Раймонд Паўлс. Сыграй, маэстра, жыццё сваё...» Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** «Баадур Цуладзэ. Я ўспамінаю». Дак. фільм.
**21.35** Жыццё цудоўных ідэй. «Падарожжа ў паралельныя сусветы».
**22.05** Улада факта. «Абуджэнне Азіі: гісторыя поспеху».
**23.45** Мастсавет.

### Настальгія

**6.00** «СеўАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Led Zeppelin». 2004 год.
**6.55, 8.35, 9.40, 11.00, 14.50, 15.40, 17.00, 18.50, 20.30, 21.40, 23.00, 0.55, 3.40, 5.35** Музычная настальгія.
**7.15** Маст. фільм «Прахіндзіяда, або Бег на месцы».
**8.50** Кінакчасопіс «Хачу ўсё ведаць!» 1975 год.
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітковскім: «Гісторыя Алімпіяды-80». 2005 год.
**13.10** Дак. фільм «Зоркі савецкага спорту».
**13.50** Маст. фільм «Вы Пецьку не бачылі?».
**18.00** «Спяем, сябры!» з Тацызнай Візбар: Юрый Гарын. 2007 год.
**19.05** Маст. фільм «Не самы ўдалы дзень».
**20.45** Кінакчасопіс «Хачу ўсё ведаць!» 1974 год.
**23.10** «Я сама». Тэма: «Я даравала здраду свайму мужу». 1995 год.
**0.00** «Трыбунал». Канцэрт Наталлі Мядзведзевай. 1995 год.
**3.00** «Іосіф Бродскі. Паэт пра паэтаў». 1992 год.
**4.00** Маст. фільм «Школьны вальс».

### EuroSport 1

**4.00, 6.30, 15.15, 1.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс».
**5.30** Лёгкая атлетыка. Гульні Паава Нурмі.
**7.30** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір.
**8.30** Лёгкая атлетыка.
**9.30, 22.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс» з Грэгам Лемондам.
**10.30, 23.30** Веласпорт. Тур Аўстрыі.
**11.00** Аўтаспорт. Формула Е.
**11.30** «Гісторыі спартсменаў».
**11.35, 18.45, 0.00, 2.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**14.45, 21.20** Watts.
**15.00, 18.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс»-экстра.
**21.35** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**0.50, 2.20** Футбол. «Фанаты Еўра».
**2.15** «Галоўны па футболе». Эрык Кантана.

### Камедыя

**0.30** Камедыя «Паліцэйская гісторыя».
**2.15** Камедыя «Хачу як Брыджэт».
**3.50** Камедыя «Старыя разбойнікі».
**5.25** Камедыя «І не чырванее».
**7.15** Камедыя «Канікулы на моры».
**9.15** Меладрама «Спатканне ўсляпую».
**11.00** Камедыя «Вясёлыя і загарэлыя».
**12.45** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**14.00, 14.50, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Шалёныя грошы».
**17.45** Камедыя «Лілі Давід».
**19.30** Камедыя «Герой месяца».
**21.15** Камедыя «Снежная нявеста».
**22.50** Камедыя «Самае горшае раство ў маім жыцці».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.20** «Доктар І...»
**7.50, 19.00, 1.50** «Курт Сеіт і Александра». Серыял.
**9.30, 3.55** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.30, 4.40** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.35** «Сляпая».
**12.35** «Шафа».
**13.30** «Тайныя знакі».
**14.30** «Каменская». Серыял.
**15.25** «Здзелка».
**15.55** «Жанна, пажані».
**16.55, 21.55** «Рэвізора».
**17.55** «Другое дыханне». Серыял.
**21.00, 1.00** «Блокбастары».
**22.52, 5.30** «Зоркі і містыка».
**23.30** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.15** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**3.25** «Нераскрытыя тайны».

### ТБ1000

**6.10, 16.10** Прыгоды «Там, дзе жывуць пачвары».
**8.10, 4.10** Прыгоды «Кінг Конг».
**11.20** Меладрама «Еш, маліся, кахай».
**14.05** Драма «Рамэа і Джульета».
**18.00** Трылер «Нічога асабістага».
**20.10** Камедыя «Лак для валасоў».
**22.10** Баявік «Шпіёнскія гульні».
**0.20** Драма «Марыя — каралева Шатландыі».
**2.20** Драма «Перапыненае жыццё».
**4.25** Камедыя «Зводныя браты».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 17.20** Меладрама «Прасвятленне».
**8.20, 2.30** Камедыя «Прыстойныя людзі».
**10.20, 4.20** Баявік «Шлях».
**12.20** Дэтэктыў «Брыльянты для дыктатуры пралетарыяту».
**14.10** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... бацька нявесты».
**15.50** Драма «Жыцьё».
**18.50** Камедыя «Сірата казанская».
**20.20** Фантастыка «Населены востраў».
**22.25** Іншае кіно. Драма «Партрэт у прыцемках».
**0.20** Меладрама «Пасылка з Марса».

### National Geographic

**6.00, 18.30** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 10.00, 13.00, 14.40, 20.20, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**7.35, 17.00** Сапраўдны супергкар.
**8.20, 17.45** Аўта-SOS.
**9.10, 13.50, 19.20** Гульні розуму.
**10.45** Экстрэмальныя даследчыкі.
**11.30** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**12.20, 21.10, 1.00, 4.00** Незвычайныя промыслы.
**15.25** Каралі шахт.
**16.10** Інстынкт выжывання.
**22.40** 90-я. Дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**23.25, 2.30** Уварванне на Зямлю.
**0.10, 3..20** Расследаванні авіякатастроф.

### Discovery

**8.00** Футбол 360.
**9.00, 14.00, 19.30** Як гэта ўстроена?
**9.30, 14.30, 19.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 17.00** Гаражнае золата.
**11.00** Рачныя монстры.
**12.00** Аўтальянцы.
**13.00** Як уладыкаваны Сусвет.
**15.00, 7.10** Што ў вас у гаражы?
**16.00, 5.30** Махінатары.
**18.00** У пошуках скарбаў.
**20.00, 3.50** Іржавая імперыя.
**21.00, 0.30, 2.00** Бітвы за кантэйнеры.
**22.00, 0.00, 2.55** Паляўнічыя на склады.
**23.00** Паляўнічыя на рачныя дыяменты.
**1.00** Склады.
**1.30, 6.20** Паляўнічыя на рэліквіі.
**4.40** Маланкавыя катастрофы.
**5.05** Сапраўдныя аферысты.

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** На гэтым тыдні паспяшайцеся завяршыць важныя справы або вярнуцца да даўно закінутых. Перш чым прыняць канчатковае рашэнне і тым больш пачаць рэалізацыю задуманага, вам варта яшчэ раз усё грунтоўна ўзважыць, параўнаць усе «за» і «супраць». Настрой і атмасфера будуць залежаць ад таго, наколькі паспяхова стануць прасоўвацца дзелавыя перамовы і вашы зносіны з блізкімі людзьмі. У выхадныя дні пастарайцеся менш расказваць староннім пра вашы ўнутрысямейныя справы.



**ЦЯЛЕЦ.** Гэта выдатны час, калі вы можаце ствараць сваю будучыню. Будзеце заўважаць цікавыя дэталі, сітуацыі, людзей, на якіх раней не звярталі ўвагі. Адстойваючы свой пункт гледжання, не будзьце занадта ўпартыя, прыслухайцеся да слоў апанента, чэрпайце нешта новае, незвычайнае, і вы пазбегнеце канфліктнай сітуацыі. Ваша сэрца можа быць напоўнена цяжкімі думкамі і ўспамінамі, але вам удасца вызваліцца ад гэтага цяжару. І хоць працэс расстання, разрыву з мінулым праходзіць заўсёды дастаткова цяжка і балюча, у канчатковым выніку вы адчуеце палёгку.



**БЛІЗНЯТЫ.** Вам неабходна прыслухацца да голасу розуму. У першую палову тыдня вы будзеце шмат кантактаваць і знаёміцца з новымі людзьмі. Паспрабуйце зрабіць прыемнае ўражанне на іх з першых слоў. Усміхайцеся і шукайце ва ўсім пазітыў. У другой палове тыдня ў вас адкрыюцца новыя крыніцы сіл. Да выхадных вы адчуеце павышэнне жыццёвага тонусу, а невялікія замінкі ў справах застануцца ў мінулым. Будзьце больш уважлівымі да старэйшага пакалення.



**РАК.** Вашы паводзіны могуць выклікаць у навакольных людзей неадназначныя ацэнкі. Пастаўцеся да гэтага спакойна, аднак лічыцеся з чужой думкай. На працягу тыдня ўзмоцніцца ваша дзелавая хватка і ўменне разбірацца ў пытаннях фінансавага характару. Актыўнасць і ініцыятыва дазволяць справіцца з магчымымі перашкодамі. Памятайце, што сілы лепш накіраваць на самую важную мэту, а не растрачваць іх па дробязях. У другой палове тыдня спрыяльна праходзіць вырашэнне фармальных пытанняў: заключэнне дагавораў, перамовы і здзелкі.



**ЛЕЎ.** На гэтым тыдні вас могуць чакаць новыя знаёмствы і нечаканыя сустрэчы. Будзьце гатовыя хутка сабрацца і адправіцца ў паездку. Сцеражыцеся падману і падвоху ў пачатку тыдня, праявіце пільнасць і ўважлівасць у любых справах. У чацвер на першы план выйдуць не словы, а ўчынкі: менавіта па іх вам варта ацэньваць навакольных. У дзелавой сферы будзе шмат папяровай працы. У пятніцу вас можа накрыць хваля раздражнення: паспрабуйце не ўчыняць занадта гучных скандалаў.



**ДЗЕВА.** Тыдзень будзе дастаткова напружаны, таму ўзбройцеся цярпеннем і будзьце сабраныя. На працы не правакуйце канфліктных сітуацый, лепш не трапляцца на вочы начальству. Праявіце больш самастойнасці і зацікаўленасці ў справах. Неўзабаве ваша старанасць будзе ацэнена. Паспрабуйце расказваць як мага менш пра сябе, пра свае планы на адпачынак. У гэты час лепш адкласці сустрэчы з сябрамі і іншыя кантакты, бо вы гатовыя ўспрымаць новую інфармацыю, а ваша пазіцыя і погляды могуць быць падставай для ўсеагульнага незадаволенасці.

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** Пачатак тыдня паглыбіць вас у вясёлую і радасную атмасферу, але, праўда, добрыя пачуцці ад зносін з блізкімі людзьмі могуць не працягнуцца доўга. Поспех абавязкова прыйдзе, але вам неабходна прыкласці некаторыя намаганні. Для пачатку — сабрацца з духам і не ленавацца. Пажадана накіраваць сваю энергію ў патрэбнае рэчышча. Ваша ініцыятыва не застанецца незаўважанай. Да серады вырашацца некаторыя праблемы, якія вас даўно турбавалі. Будзьце асцярожныя ў суботу, вы можаце лёгка паддацца вар'яцкім ідэям і трапіць у не вельмі прыемную гісторыю.

**СКАРПІЁН.** Пачатак тыдня пройдзе для вас вельмі бурна, але, на жаль, не надта радасна. Гэта час сутыкнення інтарэсаў і адкрытага процідзеяння. Ганіце ад сябе прэч змрочныя думкі. Настройцеся пазітыўна, і тут жа адбудзецца нешта добрае. Вас чакае фінансавы поспех і прыемныя любоўныя перажыванні. Выхадныя правядзіце актыўна, на прыродзе.

**СТРАЛЕЦ.** Цяперашні перыяд спрыяе пашырэнню вашага даляглядзя, могуць з'явіцца новыя цікавыя ідэі. На працы паспрабуйце неназойліва, але своечасова праявіць сябе, паказаць, на што вы здольныя. Начальства заўважыць вашу стараннасць, што адаб'ецца на зарплаце і дазволіць рэалізаваць даўнія задумы. У некаторых сітуацыях вашых навыкаў і ведаў можа аказацца недастаткова, таму на гэтым тыдні не грэбуйце зваротам па параду да іншых людзей.

**КАЗЯРОГ.** Калі вы шукаеце новую працу, то вашы пошукі могуць завяршыцца поспехам, аднак пакуль не варта пра гэта расказваць. Першая палова тыдня адгукнецца досыць сур'ёзнымі ўзрушэннямі ў фінансавай сферы. Магчымыя нечаканыя выдаткі або страты. У панядзелак будуць удалымі камандзіроўкі і пачатак падарожжаў. У аўторак лепш не пачынаць нічога сур'ёзнага. У сярэдзіне тыдня магчымыя сваркі з блізкімі людзьмі. У пятніцу ўдзяліце ўвагу дзецям. Паспрабуйце на гэтым тыдні праяўляць больш цяпла і клопату да блізкіх людзей.

**ВАДАЛЕЙ.** Вы будзеце схільныя да спантанных і неабдуманых дзеянняў. Гэта можа перашкаджаць дамагчыся патрэбнага выніку. Паспрабуйце не даваць невыканальных абяцанняў, варта быць пунктуальным і пазбягаць супярэчнасцяў з тымі, хто стаіць вышэй. У чацвер можа наступіць спрыяльны момант для звароту да начальства з прапановамі і просьбамі. У нядзелю не варта пачынаць нічога новага, ёсць верагоднасць атрымання скажонай інфармацыі.

**РЫБЫ.** На гэтым тыдні важная будзе знешняя рэспектабельнасць, так што новыя адзенне і прычоска вам не перашкодзяць. Людзі, з якімі вы працуеце, будуць аказваць на вас вялікі ўплыў, што не вельмі пажадана. Паспрабуйце мець свой погляд на ключавыя пытанні. Будзьце акуратныя ў словах і ўчынках, бо адносіны так лёгка сапсаваць! Звяртайце сваю ўвагу перш за ўсё на добрыя моманты, якія дастаўляюць вам радасць.

## Чацвер, 7 ліпеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.00** Зона Х.
**8.50** Слова Мітрапаліта Паўла на Раство Прарока, Прадцечы і Хрысціцеля Іаана.
**9.10, 10.05 Меладрама «Без правілаў», 1—2-я серыі.**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Грачанка».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Простае жыццё».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20, 0.20** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Паўфінал.
**0.55** Дзень спорту.
**1.05 Серыял «Дзявочае паляванне».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.25, 21.10** «Бітва экстрасэнсаў. Вайна тытанаў».
**11.10, 17.45 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**12.20, 18.55 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**13.20, 19.55 Серыял «Кухня».**
**14.30** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.10 Трылер «Закрытая школа».**
**17.15** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.35 Серыял «Бівер Фолс».**

### Беларусь 3

**8.00, 12.40, 18.25, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.15, 12.55** «Размовы пра духоўнае».
**8.25, 16.25 «Нестар Бурма». Серыял.**
**10.00, 19.40 «Архіў смерці». Драма.**
**11.00** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Івана Рэя.
**11.25 «Госця з будучыні». Прыгоды.**
**12.30** М/ф.
**13.10 «Паўлінка». Фільм-спектакль.**
**14.20** «Янка Купала. ...Я адплаціў народу». Дак. фільм.
**14.50** «Сіла веры».
**15.20** «Новы касмічны адлік». Дак. фільм.
**15.45** «Кіно і час». «Беларускі космас».
**18.00** «Навукаманія».
**18.40** «Размаўляем па-беларуску».
**18.45, 21.15** «Аперацыя «Багратыён». Хроніка Перамогі». «Мінск». «Вызваленне» (заключны). Дак. фільм.
**20.40** «Калыханка».
**22.10 «Я люблю вас больш за жыццё». Драма.**

### Беларусь 5

**8.00, 18.00, 22.55** PRO спорт. Навіны.
**8.10** «На шляху да ЧС-2018». Відэачасопіс.
**8.40** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. 1/2 фіналу.
**10.35** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Агляд гульнявога дня.
**11.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Ранішняя сесія.
**14.00** «Місія — Рыа». Відэачасопіс.
**14.30** «Адзін дзень на шляху да Алімпа».
**15.00, 0.20** Тэніс. Уімблдон. Жанчыны. 1/2 фіналу.
**18.05** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Вячэрняя сесія.
**20.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Першы кваліфікацыйны раунд. «Шахцёр» (Салігорск, Беларусь) — «Рунавік» (Фарэрскія астравы).
**23.05** «Жанчыны і спорт». Меліціна Станюта.
**23.35** Козел пра футбол.
**23.55** Час футбола. Еўра-2016.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Гэта Я».
- номер телефона участника в формате – код оператора, номер абонента (пример – 291961716, где 29 – код оператора, а 1961716 – номер абонента, без пробелов и символов);
- сумма по безналичной операции в белорусских рублях. В случае регистрации карт-чека, полученного за пределами Республики Беларусь, для внесения суммы безналичной операции в белорусских рублях применяется расчет по курсу Национального Банка Республики Беларусь на дату совершения соответствующей безналичной операции;
- код авторизации на соответствующем карт-чеке или номер операции для безналичных операций, совершенных он-лайн;
- дата карт-чека (дата совершения безналичной операции – согласно соответствующему карт-чеку);
- банк-эмитент карты (банк, выпустивший соответствующую банковскую платежную карточку);
- код проверки (для подтверждения регистрации).

**8.1.4.** соблюдать правила пользования банковскими платежными карточками.

**8.2.** Сохранять до выдачи призов оригинал карт-чека безналичной операции.

**8.3.** Каждая уникальная безналичная операция, зарегистрированная на Сайте и соответствующая Правилам, участвует в розыгрыше призов согласно порядку проведения розыгрыша (п.10.).

**8.4.** Регистрация каждой новой уникальной безналичной операции осуществляется через заполнение новой регистрационной формы на Сайте.

**8.5.** В случае, если уникальная безналичная операция будет зарегистрирована на Сайте более одного раза, она будет приниматься для участия в розыгрыше только один раз: по факту первой регистрации данных уникальной безналичной операции в регистрационной форме Сайта, и участвовать в розыгрыше на основании такой регистрации (повторная регистрация одного и того же карт-чека не принимается к участию в розыгрыше).

**8.6.** Не являются основанием для участия в Игре:

**8.6.1.** отсутствие регистрации на Сайте;

**8.6.2.** безналичные операции, совершенные до и после периода, указанного в п.8.1.;

**8.6.3.** операции по снятию наличных денежных средств или пополнению карт-счета;

**8.6.4.** операции, совершенные посредством банкоматов и инфокиосков;

**8.6.5.** операции по переводу денежных средств с одной банковской платежной карточки на другую банковскую платежную карточку;

**8.6.6.** операции по оплате налогов;

**8.6.7.** по размещению (пополнению) депозитов, оплате кредитных обязательств и банковских комиссий;

**8.6.8.** операции, совершенные в кассах отделений банков.

**9. Состав и размер призового фонда.**

*Таблица 1.*

| № п/п | Наименование призов, участвующих в розыгрыше | Название приза далее в Правилах | Кол-во (шт.) | Сумма за 1 ед., бел. руб., в денежных знаках образца 2000 года / в денежных знаках образца 2009 года | Сумма всего, бел. руб., в денежных знаках образца 2000 года / в денежных знаках образца 2009 года |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Телевизор Panasonic TX-50CXR700 стоимостью 21 872 000 / 2 187,20 бел. руб. + денежная сумма в размере 3 120 299 / 312,03 бел. руб. | Телевизор Panasonic TX-50CXR700 | 2 | 24 992 299 / 2 499,23 | 49 984 598 / 4 998,46 |
| 2 | Телевизор LED Panasonic TX-50CXR800 стоимостью 18 429 050 / 1 842,91 бел. руб + денежная сумма в размере 2 605 835 / 260,58 бел. руб. | Телевизор Panasonic TX- 50CXR800 | 2 | 21 034 885 / 2 103,49 | 42 069 770 / 4 206,98 |
| 3 | Фотоаппарат Panasonic Lumix DMC- SZ10 стоимостью 3 870 000 / 387,00 бел. руб. + денежная сумма в размере 430 345 / 43,03 бел. руб. | Фотоаппарат | 8 | 4 300 345 / 430,03 | 34 402 760 / 3 440,24 |

**9.1.** Призовой фонд Игры составляет сумму в размере 126 457 128 (ста двадцати шести миллионов четырехсот пятидесяти семи тысяч ста двадцати восьми) белорусских рублей в денежных знаках образца 2000 года, или 12 645,68 (двенадцати тысяч шестисот сорока пяти белорусских рублей и шестидесяти восьми копеек) в денежных знаках образца 2009 года, и формируется за счет денежных средств и имущества Заинтересованного лица.

**10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда.**

**10.1.** Место проведения розыгрышей призов – г. Минск, ул. Ольшевского, 22, пом. 20, ком. 46.

**10.2.** Всего за период проведения Игры Организатором проводится 4 (четыре) розыгрыша призового фонда, согласно Таблице 2, в ходе которых Победители будут определяться из числа регистраций транзакций всех участников, выполнивших Правила Игры, совершивших безналичные операции в установленный период:

*Таблица 2*

| Номер розыгрыша | Дата и время розыгрыша | Призы розыгрыша | Участвующие безналичные операции, зарегистрированные на Сайте в период |
|---|---|---|---|
| 1 | 15.07.2016 г. в 15:00 | 1. Телевизор Panasonic TX-50CXR700 – 1 (одна) шт. 2. Фотоаппарат – 2 (две) шт. | с 00 ч 00 мин 04.07.2016 г. по 23 ч 59 мин 12.07.2016 г. |
| 2 | 27.07.2016 г. в 15:00 | 1. Телевизор Panasonic TX-50CXR700 – 1 (одна) шт. 2. Фотоаппарат – 2 (две) шт. | с 00 ч 00 мин 13.07.2016 г. по 23 ч 59 мин 24.07.2016 г. |
| 3 | 05.08.2016 г. в 15:00 | 1. Телевизор Panasonic TX-50CXR800 – 1 (одна) шт. 2. Фотоаппарат – 2 (две) шт. | с 00 ч 00 мин 25.07.2016 г. по 23 ч 59 мин 02.08.2016 г. |
| 4 | 19.08.2016 г. в 15:00 | 1. Телевизор Panasonic TX-50CXR800 – 1 (одна) шт. 2. Фотоаппарат – 2 (две) шт. | с 00 ч 00 мин 03.08.2016 г. по 23 ч 59 мин 16.08.2016 г. |

**10.3.** Для осуществления розыгрыша Организатор присваивает всем регистрациям базы данных безналичных операций, соответствующим Правилам, уникальные номера (далее – «номера») в хронологическом порядке согласно дате и времени регистрации безналичных операций на Сайте (далее – «массив»).

**10.4.** Для определения выигрышных номеров Организатор использует лототрон и набор шаров в количестве 10 (десяти) штук с цифрами от 0 (нуля) по 9 (девять).

**10.5.** Определение выигрышных номеров происходит путем их формирования слева направо из цифр в шарах, поочередно извлекаемых из лототрона.

**10.6.** Для определения цифры первого слева разряда выигрышного номера Организатор помещает в лототрон шары с цифрами от 0 (нуля) до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего по порядку номера в массиве. Организатор извлекает из барабана один шар. Цифра из извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

**10.7.** Далее в лототрон загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, цифра в котором определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах номеров массива. При наличии совпадения цифра вытянутого шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера – и шар возвращается в лототрон; в противном случае – извлеченный шар с цифрой не возвращается в лототрон, и Организатор извлекает следующий шар до получения нужного совпадения. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон цифр соответствующих разрядов номеров в массиве.

**10.8.** Полученный выигрышный номер сверяется с базой данных безналичных операций и в формирующейся базе выигрышных номеров указывается фамилия, имя и отчество, адрес электронной почты (e-mail) и номер телефона. После определения первого выигрышного номера все последующие участники выигрышных номеров сверяются с формирующейся базой выигрышных номеров по фамилии и имени, адресу электронной почты (e-mail) и/ или номеру телефона. Если в ходе сверки какой-либо выигрышный номер принадлежит Участнику, который уже указан в базе выигрышных номеров, Организатор определяет другой выигрышный номер.

**10.9.** После определения победителей каждого розыгрыша для обеспечения полной выдачи призов Организатор осуществляет определение 2 (двух) резервных выигрышных номеров способом, установленным в п.10.4. – 10.8. Правил.

**10.10.** Призы вручаются резервным победителям в случае, если основной победитель:

**10.10.1.** отказывается от получения приза, о чем письменно извещает Организатора;

**10.10.2.** указал недостоверную информацию при регистрации безналичной операции на Сайте;

**10.10.3.** нарушает (не выполняет) условия Правил (в том числе не предоставляет необходимые подтверждающие документы, указанные в Правилах, в сроки и в порядке, установленные Правилами);

**10.10.4.** не является для получения приза в сроки, установленные Правилами.

**10.11.** В случае если и основной, и резервный победитель, претендующие на получение призов, не обеспечивают соблюдение условий Правил, в результате чего теряют право получения Призов, такие Призы остаются в распоряжении Организатора.

**11.** Срок и способ информирования победителей розыгрыша, место, порядок и сроки вручения призов.

**11.1.** Организатор уведомляет о выигрыше по электронной почте, а также дополнительно по контактному номеру телефона, указанных участниками при регистрации безналичной операции в регистрационной форме на Сайте победителей:

**11.1.1.** первого розыгрыша – по 19.07.2016 г. включительно;

**11.1.2.** второго розыгрыша – по 01.08.2016 г. включительно;

**11.1.3.** третьего розыгрыша – по 10.08.2016 г. включительно;

**11.1.4.** четвертого розыгрыша – по 24.08.2016 г. включительно.

**11.2.** При условии возникновения необходимости вручения призов резервным победителям Организатор уведомляет о выигрыше по электронной почте, а также дополнительно по номеру контактного телефона, указанных участниками при регистрации безналичной операции в регистрационной форме на Сайте резервных победителей:

**11.2.1.** первого розыгрыша – по 26.07.2016 г. включительно;

**11.2.2.** второго розыгрыша – по 09.08.2016 г. включительно;

**11.2.3.** третьего розыгрыша – по 17.08.2016 г. включительно;

**11.1.4.** четвертого розыгрыша – по 01.09.2016 г. включительно.

**11.3.** Победители/ резервные победители могут получить выигранные ими призы по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 22, пом. 20, к. 46 в рабочие дни с 10:00 до 17:00, предоставив Организатору лично:

**11.3.1.** документ, удостоверяющий личность;

**11.3.2.** свои паспортные данные (данные вида на жительство): ФИО, серия и номер паспорта (вида на жительство), дата выдачи, орган, выдавший паспорт (вид на жительство), идентификационный номер, адрес регистрации;

**11.3.3.** оригинал карт-чека выигрышной безналичной операции или выписку банка, заверенную печатью банка, подтверждающую осуществление соответствующего платежа с использованием сети Интернет;

**11.3.4.** банковскую платежную карточку, по которой была совершена соответствующая выигрышная безналичная операция;

**11.3.4.1.** в случае закрытия карт-счета на момент получения приза – прекративший действие оригинал договора на открытие карт-счета, к которому относилась банковская платежная карточка, по которой была совершена соответствующая выигрышная безналичная операция.

**11.4.** В случае, если победитель не может получить приз лично, приз может получить его законный представитель (доверенное лицо), предоставив лично доверенность от победителя на получение приза, заверенную нотариально, и документы согласно п. 11.3.1. – 11.3.4. Правил.

**11.5.** Победители (законные представители победителей) обязаны явиться для получения призов в следующие сроки:

**11.5.1.** первого розыгрыша – по 22.07.2016 г. включительно;

**11.5.2.** второго розыгрыша – по 04.08.2016 г. включительно;

**11.5.3.** третьего розыгрыша – по 15.08.2016 г. включительно

**11.5.4.** четвертого розыгрыша – по 29.08.2016 г. включительно.

**11.6.** При условии возникновения необходимости вручения призов резервным победителям, резервные победители (законные представители резервных победителей) обязаны явиться для получения призов в следующие сроки:

**11.6.1.** первого розыгрыша – по 29.07.2016 г. включительно;

**11.6.2.** второго розыгрыша – по 12.08.2016 г. включительно

**11.6.3.** третьего розыгрыша – по 23.08.2016 г. включительно;

**11.6.4.** четвертого розыгрыша – по 06.09.2016 г. включительно.

**11.7.** Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента Призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче Призов ограничена количеством и видом призов, указанных в Правилах.

**11.8.** Организатор не несет ответственности за любые риски, связанные с повреждением призов и их эксплуатацией, возникшие после передачи призов Победителям.

**11.9.** При получении призов победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь и осуществляется Организатором. Удержание с победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи приза из денежной части приза (денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере).

**12. Права и обязанности участников Игры.**

**12.1.** Принимая участие в Игре, участники подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования Правил и законодательства, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением призов.

**12.2.** Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения в рамках данной Игры.

**12.3.** Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио и видео интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения данной Игры. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

**12.4.** Участники при заполнении регистрационной формы на Сайте обязаны вводить достоверную информацию. Организатор не несет ответственности за достоверность данных, внесенных участниками в регистрационную форму, а также за последствия внесения участником недостоверной информации в регистрационную форму.

**12.5.** Победители, претендующие на получение призов, обязуются заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности, необходимые для получения призов.

**13. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил и результатов розыгрыша, сроки публикации.**

**13.1.** Правила Игры подлежат публикации в газете "Звязда" до начала Игры.

**13.2.** Результаты розыгрышей Игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 13.09.2016 г.

**14. Общие положения.**

**14.1.** Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Игры, а также результаты проведения Игры, будут считаться окончательными и будут распространяться на всех участников.

**14.2.** Во избежание сомнений, компания Visa International Service Association и любые ее аффилированные лица не являются Организатором, не принимают участия в розыгрыше, а также определении победителей, не несут ответственности за соблюдение Организатором Правил, законодательства Республики Беларусь, а также не отвечают по претензиям участников Игры.

**14.3.** Информацию об условиях участия и проведения Игры можно получить по телефону «горячей линии» +375 (29) 196-17-16 с 10:00 до 17:00 в рабочие дни, а также на Интернет-сайте www.visa.com.by.

Свидетельство №2787 о государственной регистрации рекламной игры выдано 21 июня 2016 г. Министерством торговли Республики Беларусь.

# ДАСТОЙНЫ НАШЧАДАК

## Унук рэвалюцыянераў з Пухавіччыны дасягнуў немалых вышынь у ядзернай фізіцы і напісаў манаграфію пра... бессмяротнасць душы

**Біяграфія рэвалюцыянераў-народнікаў Бонч-Асмалоўскіх добра вядомая на Пухавічыне. Ды і ўвогуле ва ўсёй Беларусі. Падрабязна пра «гняздо рэвалюцыйнай заразы» ў Блоні расказаў у кнізе «У часіну выпрабаванняў» гісторык Барыс Клейн. Матэрыялы пра Анатоля Восіпавіча Бонч-Асмалоўскага і Варвару Іванаўну Вахоўскую ёсць у Пухавіцкім раённым краязнаўчым музеі ў вёсцы Блонь. Вядомыя і біяграфіі дзяцей гаспадароў маёнтка. Як і бацька і маці, яны прымалі ўдзел у рэвалюцыйнай рабоце. Біяграфія сыноў, дачкі Анатоля Восіпавіча і Варвары Іванаўны, кожнага з іх, — сапраўды, тэма рамана, асобнага грунтоўнага мастацкага ці дакументальнага даследавання.**



Адна з яркіх асоб — малодшы сын рэвалюцыянераў: Глеб Анатольевіч Бонч-Асмалоўскі. Нарадзіўся ён у лістападзе 1890 года ў Блоні. Вучыўся ў Блонскім народным вучылішчы, а пасля ў Мінскім камерцыйным вучылішчы. Можна шмат расказваць пра яго няпросты лёс. Зараз заўважу толькі адно: за археалагічныя вышукі, раскопкі на тэрыторыі Крыма і кнігі «Грот Кік-Коба» і «Кісць выкапнёвага чалавека з грота Кік-Коба» нашаму земляку прысвоена вучоная ступень доктара гістарычных навук.

Хацелася б распавесці пра адзін з атожылкаў слаўнага роду Бонч-Асмалоўскіх — сына Глеба Анатольевіча, унука Анатоля Восіпавіча і Варвары Іванаўны. Расказаць пра доктара фізіка-матэматычных навук Андрэя Глебавіча Бонч-Асмалоўскага. У лёсе яго выразна выяўляецца рыса інтэлігентнага чалавека — быць вартым гонару і годнасці сваіх прашчураў.

Мажліва, камусьці падасца, што стаць вучоным з такой сям'і, якую заклалі, сфарміравалі яшчэ ў дзевятнаццатым стагоддзі блонскія гаспадары, досыць лёгка і проста. Як жа было на самай справе? На жаль, адказ ад самога Андрэя Глебавіча, які колькі гадоў назад пайшоў з жыцця, атрымаць я ўжо не змагу. Маім памагатым ва ўзнаўленні ісціны з'явілася жонка вучонага — кандыдат фізіка-матэматычных навук Наталля Аляксандраўна Бонч-Асмалоўская. Яна разам з мужам жыла і працавала ў сусветна вядомым гарадку расійскіх фізікаў (так і карціць напісаць: савецкіх фізікаў, бо, лічы, усе навукоўцы, што сабраліся тут за мінулыя дзесяцігоддзі, працавалі на магутную абарону магутнай краіны) — у падмаскоўнай Дубне.

У 1952 годзе Андрэй Бонч-Асмалоўскі закончыў Ленінградскі ўніверсітэт. Бацькі на той час ужо не было — памёр у лістападзе 1943 года. На пачатку 1930-х гадоў Глеб Анатольевіч, як і брат Радзівон, быў арыштаваны. Праўда, у турме пратрымалі нядоўга. Пасля вызвалення ў 1934—1936 гадах быў высланы і працаваў геолагам у Пячорскім рудаўпраўленні. Затым вярнуўся ў Ленінград.

— Па спецыяльнасці Андрэй — фізік-тэарэтык. Вучыўся ён выдатна, — расказвае ўжо пра свайго мужа і ўнука блонскіх рэвалюцыянераў Наталля Аляксандраўна. — Рэкамендавалі яго для паступлення ў аспірантуру. Але, на вялікі жаль, замест таго каб набірацца вышынь у навуцы, вымушаны быў ісці на завод электраабсталявання. Прычына — «грахі прашчураў». Хоць бацьку — Глеба Анатольевіча — рэабілітавалі яшчэ ў 1940-я... А тады, як Андрэй заканчваў вучобу, бацькі ўжо і ў жывых не было. Усё гэта сталася вялікім ударам для маладога чалавека...

Але ўнук і сын рэвалюцыянераў аказаўся чалавекам настойлівым і мужным. Ён не адмовіўся ад сваіх мар. І «каб не звар'яцець канчаткова» (так Андрэй пасля расказваў сваім блізкім), пасля работы хадзіў у бібліятэку, перакладаў з англійскай мовы «Квантавую механіку» Дзірака. І разам з тым, як чалавек здольны, вынайшаў на заводзе фотаэкспанометр, які быў запушчаны ў вытворчасць.Таленавітага інжынера прызначылі начальнікам аддзела. Але думаць пра навуку малады чалавек не пакідаў. І пасля таго, як Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў выступіў на XX з'ездзе КПСС з дакладам, у якім развянчаў культ асобы Сталіна, пачалася шырокая рэабілітацыя бязвінна асуджаных, Андрэй Глебавіч атрымаў даведку аб рэабілітацыі бацькі і адразу ж звольніўся з завода. Бонч-Асмалоўскі паступае ў аспірантуру Ленінградскага электратэхнічнага інстытута. З гэтай ВНУ Андрэй меў стасункі і ў час работы на заводзе. Датэрмінова, за два гады, абараніў кандыдацкую дысертацыю. Сам вылучыў ідэю, распрацаваў яе, сканструяваў і сам зрабіў прыбор, на якім атрымаў звышвысокія магнітныя палі. Пасля абароны дысертацыі маладога вучонага пакінулі ў ЛЭТІ на пасадзе дацэнта. Андрэй Глебавіч вёў навуковую работу і выкладаў.

— У 1962 годзе, — расказвае Наталля Аляксандраўна, — мы пераехалі ў Дубну...

Невялікае адступленне. Дубна — класічны савецкі навукаград. Фарміравацца пачаў пасля Вялікай Айчыннай вайны. У 1947 годзе па ініцыятыве групы вучоных на чале з акадэмікам І.В.Курчатавым за 120 км ад Масквы пачался будаўніцтва на беразе Волгі ядзернага паскаральніка — сінхрацыклатрона. Быў адкрыты Інстытут ядзерных праблем. Затым заснавана Электрафізічная лабараторыя Акадэміі навук СССР. Менавіта ў ёй пачаліся работы па стварэнні новага паскаральніка — сінхрафазатрона з рэкордным для таго часу параметрамі. Ішоў час, мянялася псіхалогія. Вучоны свет разумеў, што ядзерная навука не можа быць прыналежнасцю толькі засакрэчаных лабараторый. У 1954 годзе паблізу Жэневы ствараецца Еўрапейская арганізацыя ядзерных даследаванняў. Мэта — кансалідацыя намаганняў заходнееўрапейскіх краін у вывучэнні фундаментальных уласцівасцяў мікрасвету. Прыблізна ў гэты час савецкі ўрад прымае рашэнне аб'яднаць Інстытут ядзерных праблем і згаданую ЭФЛАН. Да ініцыятывы далучаюцца сацыялістычныя краіны. 26 сакавіка 1956 года ў Маскве падпісваецца пагадненне аб стварэнні Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў. Тады ж у Дубну прыязджаюць спецыялісты з 12 краін. Разварочваецца грунтоўная работа з улікам інтарэсаў навуковых цэнтраў дзяржаў — членаў АІЯД. З гісторыяй гэтай унікальнай даследчыцкай установы звязаны лёсы сусветна вядомых вучоных Ігара Васільевіча Курчатава, Леапольда Інфельда, Ігара Тана, ды шмат каго яшчэ. Зараз у Інстытуце — 18 краін-удзельніц. Сярод іх — і Беларусь. Дарэчы, некаторы час назад міжнародны камітэт прэстыжнага навуковага цэнтра ўзначаліў прадстаўнік Беларусі.

Якраз з 1962 года і працаваў у Аб'яднаным інстытуце ядзерных даследаванняў нашчадак слаўнага роду. Займаўся Андрэй Глебавіч тэхнікай паскарэння. «Не трэба думаць, што гэта праблема толькі інжынернага кшталту, — гаворыць Наталля Аляксандраўна Бонч-Асмалоўская. — Без папярэдняй тэорыі ніводны паскаральнік не запрацаваў бы. Паскарэнне малекул, атамаў, іх мікраскапічных складальнікаў — гэта электрадынаміка...»

У Дубне Андрэй Бонч- Асмалоўскі абараніў доктарскую дысертацыю. Калі расказваюць пра вучонага, пералічваюць яго вучнаў. Стараюцца падкрэсліць колькасныя абсягі надрукаваных прац, манаграфій. У выпадку з фізікамі-ядзершчыкамі ўсё прасцей і складаней. Вучоныя, дасягнуўшы ўнікальных інтэлектуальных, разумовых вышынь, працавалі індывідуальна, замкнуўшыся ў коле ўласных навуковых праблем. Часам — такога маштабу, што вырашэнне іх патрабавала многіх і многіх месяцаў. Таму і не было вучняў, а што да публікацый, то навуковая дзялянка патрабавала ўкладаць сілы ў іншае. Трэба было, атрымаўшы складанае заданне, як найхутчэй яго выканаць. Ды і агучванне здабыткаў не заўсёды заахвочвалася. Усё ж ядзерная фізіка...

Калі выйшаў на пенсію, Андрэй Глебавіч некаторыя вынікі сваіх навуковых доследаў аформіў у манаграфію «Фізіка новых метадаў паскарэння зараджаных часціц». Кніга была надрукавана за межамі Расіі. Але галоўнае, чым апекаваўся Бонч-Асмалоўскі ў апошнія гады жыцця (памёр ён 19 студзеня 2001 года), — філасофская праца. На жаль, кніга «Спроба параўнання рэлігійных і навуковых уяўленняў пра бессмяротнасць душы» так і засталася ў рукапісе.

Удава Андрэя Глебавіча, Наталля Аляксандраўна, таксама фізік — кандыдат фізіка-матэматычных навук. Займалася эксперыментамі ў галіне ядзернай фізікі. Андрэй Глебавіч і Наталля Аляксандраўна выхавалі дваіх дзяцей. Дачка Марына Андрэеўна Бонч-Асмалоўская — вядомая руская пісьменніца, аўтар некалькіх празаічных кніг.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

■ Неасабісты суб'ектыў



# НУ, ЗА ЛЮДСКАСЦЬ!

## Слова прыгожае, а ці ведаем мы яго значэнне?

У сезонным аўтобусе, які адпраўляўся з дачнага пасёлка а палове шостай вечара, людзей было няшмат — такой гарачынёй выпраўляюцца ў дарогу толькі па самай пільнай патрэбе. Ехалі ў асноўным людзі немаладыя — пенсіянеры без машын, для якіх гэта параўнальна танны і ледзь не адзіны спосаб дабрацца да лецішча. Хтосьці вяртаўся з выхадных у горад, бо яшчэ недзе падпрацоўвае, хтосьці вёз поўныя вёдры праспелых клубніц — ягадам жа не патлумачыш пра спёку, скісінуць да заўтра — і выкідвай.

Аўтобус шпарка імчаў у сталіцу, не заходзячы ні ў адну з недалёкіх вёсак — яго летам пускаюць спецыяльна для дачнікаў, і прыпынкі ў яго — толькі ля дачных пасёлкаў. Заходзілі на кожным усё тыя ж пенсіянеры з валізкамі — стомленыя ад чакання на сонцы, выціраючы насоўкамі пот з чырвоных тавраў. Усе паміж сабой за гады агульнай дарогі знаёмыя, яны весела віталіся, абмяркоўвалі надвор'е, перспектывы на ўраджай, цэны ў крамах і на рынках... Карацей, правінцыяльная ідылія "як у кіно", не хапала хіба што жывой гусі ў кашы ў кагосьці на каленях для поўнага падабенства...

Ідылія парушылася раптоўна, калі аўтобус, не збаўляючы ходу, прамчаў міма спачатку аднаго прыпынку, на якім ужо падхапілі клункі ды вёдры ўсё тыя ж размалеваныя ад спёкі пенсіянеры, пасля — міма другога. Людзі ў салоне пачалі абурацца, хтосьці стукаў у кабіну вадзіцеля (а той усё цісну ў на газ), хтосьці здзіўлена пляскаў рукамі, паўтараючы: "Людцы, што ж гэта робіцца?!" Пра тое, што адбывалася на пакінутых ззаду прыпынках, можна толькі здагадвацца. Улічваючы, што наступны аўтобус ішоў праз тры гадзіны, а да бліжэйшых хат ад тых прыпынкаў сама меней кіламетр.

Кіламетраў праз пяць, у вялікай дачнай вёсцы, аўтобус спыніўся-такі. Кіроўца, немалады ўжо мужчына са стомленым тварам, на абураныя папрокі расхваляваных бабуль спакойна патлумачыў: маўляў, тыя прыпынкі, якія ён мінуў, літаральна два дні назад знялі з гэтага маршруту, таму ён і не спыняўся. Ходзіць па гэтай дарозе яшчэ шмат прыгарадных аўтобусаў, таму гэты вырашылі зрабіць яшчэ больш хуткасным. Аб'явы на касах аўтавакзала віселі. Хто не пачытаў — яго праблемы. Хтосьці, можа, на той дачы з вясны сядзіць, проста не ведаў пра гэткія змены — яго праблемы таксама. «Людзі такой гарачынёй стаялі, чакалі — няўжо нельга было спыніцца?» — «Не, нельга было: як з іх грошы брацы, калі прыпынак у касу не забіты? Я нічога парушаць не хачу, у мяне інструкцыя». — Ты ж нічога не парушаеш, людзі на абазначаным прыпынку стаялі, а не ў чыстым полі. Узяў бы аплату як з папярэдняга прыпынку, даражэй, а старым бы сказаў, каб не спадзяваліся больш адсюль паехаць». «Вось яшчэ, буду я білеты перабіваць». — «А людзей табе не шкада? А каб твая маці там на сонцы палілася?» — «Людзі самі вінаватыя, а маці мая даўно памерла». — «А калі па-чалавечы?» — «А за «па-чалавечы» мне прэмію не дабавяць і не знімуць. А вы не адцягвайце ўвагу вадзіцеля падчас руху, бачыце, беларускай мовай вам напісана!»

Зачыніў шыбу, закрыўся ў сваёй кабіне-каморцы і, сцяўшы вусны, працягваў круціць руль. Астатні шлях быў невясёлы, маўклівы. Кожны думаў аб сваім (ці аб адным?), і гаварыць пра гэта ўголас нікому не хацелася...

...Калі збіраемся ў добрай сяброўскай бяседзе, калі ўжо сказана і «за здароўе», і «за сустрэчу», і «за каханых», адзін наш сябар заўсёды кажа: «Ну, а цяпер — за людскасць!» Што ж, можна і за людскасць, за тое, каб не забываліся, што ёсць у беларускай такое паняцце.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

# ЛЕТА З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ

**Міжнародная летняя школа беларусістыкі адкрылася ў БДУ.**

У Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы БДУ для вывучэння беларускай мовы прыехалі больш як 70 слухачоў з Аўстраліі, Індыі, Украіны, Японіі, Партугаліі, Венгрыі, Чэхіі, Германіі і Кітая. Праграма ўключае 48 гадзін аўдыторных заняткаў па практыцы беларускага маўлення: фанетыцы, граматыцы, развіццю вуснай і пісьмовай мовы, а таксама спецыяльныя лекцыйныя курсы па розных аспектах вывучэння беларускай мовы, літаратуры, гісторыі і культуры. Акрамя таго, слухачы будуць задзейнічаны ў інтэрактыўных занятках, майстар-класах і адукацыйных экскурсіях.

Культурная праграма для замежных гасцей уключае наведванне Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, экскурсію ў Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа і г. д. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі кафедра маладзёжнай палітыкі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы і БДУ.

Міжнародная летняя школа беларусістыкі будзе працаваць да 15 ліпеня ўключна.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ПРЫПЯЧЭ ДА АРАНЖАВАГА ЎЗРОЎНЮ...

## На выхадныя сіноптыкі прагназуюць павелічэнне тэмпературы да плюс 34 градусаў

**У першыя дні ліпеня на тэрыторыю Беларусі зноў вяртаецца спёка, паведамляе галоўны сіноптык Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Святлана Рыбакова.**

Таму сёння тэмпература паветра ўздзень складзе плюс 30-32 градусы, а па паўночным усходзе краіны на 2-3 градусы ніжэй. На поўдні будзе ажно плюс 34 градусы. Удзень месцамі па паўночным захадзе пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы.

Уначы на суботу — плюс 15—22 градусы. У асобных раёнах прагназуюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Удзень тэмпература паветра падніміцца да плюс 27—32 градусаў, а па поўдні — да плюс 34.

3 ліпеня на тэрыторыю Беларусі завітае атмасферны фронт, які рухаецца з боку Заходняй Еўропы. У сувязі з гэтым уначы месцамі, а раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы рознай інтэнсіўнасці. Удзень у асобных раёнах чакаюцца моцныя дажджы, магчымы град. Месцамі навальніцы будуць суправаджацца моцным парывістым ветрам. Уначы тэмпература паветра чакаецца ў межах плюс 15—22 градусы, а ўдзень будзе да 22—29 цяпла. Па ўсходзе па-ранейшаму будзе горача, дзе тэмпература паветра складзе плюс 30—34 градусы. У сувязі з такой анамальнай гарачынёй айчынныя спецыялісты аб'яўляюць на выхадныя аранжавы ўзровень небяспекі.

Больш свежая хваля паветра завітае да нас у панядзелак, калі ўначы пад уплывам франтальнага раздзелу на большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах — моцныя. Тады ўначы тэмпература паветра панізіцца да плюс 10—17 градусаў, а ўдзень будзе толькі плюс 20—27 градусаў. Аднак па паўднёвым усходзе краіны тэмпература паветра ўначы складзе18—20 цяпла, а ўдзень будзе плюс 28—32 градусы.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў беларускіх сіноптыкаў, у аўторак і сераду надвор'ем пачнуць кіраваць малаактыўныя атмасферныя франты і ўмерана цёплыя паветраныя масы з боку Заходняй Еўропы. У асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 10 да 17 цяпла, а ўдзень чакаецца плюс 20—27 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## ІСЛАНДЫЮ ЎЗНОСЯЦЬ, АНГЛІЮ ВЫСМЕЙВАЮЦЬ

Каманда Ісландыі стала зборнай №1 на гэтым Еўра па частцы згадак у інфармацыйных зводках. У адборачным турніры паўночнікі абышлі Турцыю і



Галандыю, а ў фінальным не атрымалі ніводнага паражэння. Аднак сенсацыйная перамога над англічанамі і выхад у чвэрцьфінал ужо на дэбютным чэмпіянаце літаральна ўзарвалі інтэрнэт. І справа не толькі ў тым, што зборная краіны з насельніцтвам у 320 тысяч чалавек абыграла 53-мільённую Англію з даўнімі традыцыямі і найбагацейшай лігай свету. Сявдомыя аўтсайдары не так ужо рэдка перамагаюць фаварытаў на буйных турнірах, а зборная Грэцыі ўзору 2004 года дык і наогул выйграла чэмпіянат Еўропы.

Аднак усё ў гэтай перамозе склалася такім чынам і ў такі час, што яна была асуджаная стаць эпічнай. Brexit, які, здаецца, шакіраваў саміх брытанцаў больш, чым каго б там ні было, брутальная знешнасць і стрыманая гульня ісландцаў і нават завяршэнне шостага сезона «Гульні тронаў» стварылі вакол матча асаблівую атмасферу, якая выклікала ў інтэрнэце дзясяткі пародый і мемаў. Шмат хто ў жартах чакана параўноўваў вылет англійскай зборнай з Брытаніі з Еўрасаюза: «Англія — адзіная краіна, якая пакінула Еўропу двойчы за тыдзень». Англійскія аматары футбола нават спарадыравалі петыцыю за паўторны рэферэндум. У іх варыянце яна заклікае галасаваць за перагульванне. Персанальна дасталася галкіперу англійскай каманды Джо Харту, які прапусціў недарэчны гол ад Сігтарсана. «Ісландыя, здаецца, недарагая краіна, але Харт не сэканоміў нічога» (гульня слоў, маецца на ўвазе — не зрабіў сэйв, не ўратаваў).

Вельмі агнявой фразай вызначыўся былы форвард англічан Гары Лінекер, які цяпер працуе экспертам. «Горшае паражэнне ў нашай гісторыі. Англія прайграла краіне, дзе вулканаў больш, чым прафесійных футбалістаў. Ісландцы гулялі выдатна», — напісаў ён у «Твітары».

### АРЭНДУЮ САМАЛЁТ

Футбольны фанат з Ісландыі Грэтар Сігфінур Сігурдарсан арандаваў «Боінг-737», каб злятаць у Ніцу і назад на матч паміж нацыянальнай зборнай краіны і камандай Англіі. Практ паветранага судна, якое ўмяшчае да 180 пасажыраў, абышоўся яму прыблізна 172 тысячы еўра. Пра тое, што ён арандаваў самалёт, Сігурдарсан абвясціў на сваёй старонцы ў Facebook, і з усіх, хто пажадаў далучыцца да яго, спаганяў плату ў памеры 920 еўра. Пры гэтым, як адзначае The Daily Mirror, амаль усе месцы ў лайнеры былі раскуплены.

### УСЁЙ КРАІНАЙ

Матч 1/8 фіналу чэмпіянату Еўропы па футболе паміж зборнымі Англіі і Ісландыі глядзелі 99,8% ісландскіх тэлегледачоў. Гэты вынік пабіў папярэдні рэкорд ісландскага тэлебачання, які быў устаноўлены падчас паядынку трэцяга тура групавога этапу з аўстрыйцамі — 98,5%.

### МАГЧЫМЫ ПАДЗАРОБАК

Брытанская анлайн-крама адзення ASOS прапанавала паўабаронцу зборнай Ісландыі Біркіру Б'ярнасану стаць мадэллю, паведамляецца на старонцы ASOS у «Твітары». «Прывітанне, Біркір Б'ярнасан. Калі скончыце выступаць на Еўра-2016, патэлефануйце нам. Мы маглі б задзейнічаць вас у паказах», — напісалі прадстаўнікі крамы.

### ХОДЖСАН СЫШОЎ

Галоўны трэнер зборнай Англіі Рой Ходжсан падаў у адстаўку пасля паражэння ад Ісландыі ў 1/8 фіналу. Ходжсан узначаліў нацыянальную каманду



ў маі 2012 года. Пад яго кіраўніцтвам на Еўра-2012 англічане выйшлі з групы, але ў чвэрцьфінале па пенальці прайгралі італьянцам, а на сусветным першынстве 2014 года падапечныя Ходжсана занялі апошняе месца ў групе, набраўшы толькі 1 ачко.

### НАШЫ МАЙКІ ЛЕПШЫЯ

Падсыпаў трохі солі на раны англічанам і вытворца спартыўнай экіпіроўкі Umbro. У «Твітары» ён апублікаваў жартаўлівае паведамленне ў сувязі з паражэннем Англіі ад Ісландыі. «Зборная Англіі была добрая, калі яе футбалісты насілі нашу форму», — гаворыцца ў паведамленні Umbro. Англійская зборная пачала супрацоўніцтва з Umbro ў 50-я гады мінулага стагоддзя, у форме Umbro англічане выйгралі чэмпіянат свету 1966 года і заваявалі бронзавыя медалі Еўра-1968 і Еўра-1996. Тры гады таму англічан стала экіпіраваць кампанія Nike.

### МЕДАЛЬ ДЛЯ БАЛЕЛЬШЧЫКАЎ

Балельшчыкі зборнай Ірландыі ў знак прызнання іх узорных паводзін атрымалі ад гарадскіх улад Парыжа спецыяльную медаль. Аб узнагароджанні медалём Гран Вермей за ўзорныя паводзіны ірландскіх балельшчыкаў абвясціла мэр французскай сталіцы Ан Ідальга. «Іх паводзіны былі ў найвышэйшай ступені пазітыўнымі. Яны былі ўзорам для пераймання. Хочам сказаць ім дзякуй», — сказала Ідальга ў фан-зоне ў Парыжы. Раней медалём Гран Вермей узнагароджвалі сярод іншых пісьменніцу Тоні Морысан, джазавага піяніста Херба Хэнкока і дзевяціразовага пераможцу «Ралан Гарос» Рафаэля Надаля.

### САМЫ ВЫНІКОВЫ

Гол Кальбейна Сігтарсана ў вароты англічан стаў 88-м на турніры. Такім чы-



нам, па колькасці галоў бягучы чэмпіянат Еўропы выйшаў на першае месца ў гісторыі. Папярэдні рэкорд выніковасці трымаў Еўра-2000, на якім было забіта 85 галоў. Зразумела, гэты рэкорд стаў магчымым у першую чаргу таму, што на Еўра-2016 упершыню ў гісторыі гуляе 24 каманды, і колькасць галоў яшчэ павялічыцца. З 1960 года да 1976-га ў турніры ўдзельнічалі 4 каманды, з 1980-га па 1992-гі — 8, з 1996-га па 2012-ты — 16.

* * *

Учора позна ўвечары матчам Партугалія — Польшча пачалася 1/4 фіналу Еўра-2016, Уэльс з апантаным Бэйлам сёння згуляе з Бельгіяй, якая спіць і бачыць сябе ў фінале. Заўзятара аматараў футбола чакае супергульня, вартая фіналу (Італія — Германія), ну а 3 ліпеня ісландцы паспрабуюць стварыць другую сенсацыю і абыграць гаспадароў-французаў. А мы з вамі будзем «хварэць» за прыгожы футбол.

**Іван КУПАРВАС.**

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.42 | 21.44 | 17.02 |
| Віцебск — | 4.24 | 21.42 | 17.18 |
| Магілёў — | 4.32 | 21.35 | 17.03 |
| Гомель — | 4.38 | 21.21 | 16.43 |
| Гродна — | 4.59 | 21.58 | 16.59 |
| Брэст — | 5.09 | 21.48 | 16.39 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 27.06–03.07.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

**Імяніны**

*Пр.* Аляксандра, Васіля, Лявонція, Сяргея.
*К.* Галіны, Рэгіны, Юльяна.



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Сёння ў Тані разгрузачны дзень, таму ў «Макдональдс» яна прыйшла пешшу.**

— Пятровіч, а ты чаго дровы седзячы колеш?
— Ды спрабаваў лежачы, не атрымалася.

**Звычайна пасля завяршэння конкурсу прыгажосці ў грымёрцы ўдзельніцы дзеляцца на тых, хто прайграў, і авечку.**

Жанчына — мужчыну:
— Чаму вы на мяне глядзіце?
— Я не гляджу на вас!
— Так, я не зразумела!.. Чаму вы на мяне не глядзіце?!

**Фразай «гусь свінні не таварыш» індык справакаваў бойку хлеў на хлеў.**

— Паненка, сядайце, падвязу!
— Няма калі мне, ісці трэба.




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

## Неспрыяльныя дні і гадзіны ў ліпені

**1, пятніца,** *2.00 — 14.00*
**3, нядзеля,** *6.00 — 15.30*
**5, аўторак,** *8.30 — 18.30*
**7, чацвер,** *14.00 — 23.00*
**10, нядзеля,** *5.30 — 10.30*
**12, аўторак,** *17.00 — 22.30*
**14, чацвер,** *23.00 — 24.00*
**17, нядзеля,** *11.00 — 21.30*
**19, аўторак,** *23.00 — 24.00*
**20, серада,** *0.00 — 5.00*
**22, пятніца,** *4.00 — 10.30*
**24, нядзеля,** *9.00 — 14.30*
**26, аўторак,** *8.30 — 17.30*
**28, чацвер,** *17.00 — 20.00*
**30, субота,** *14.00 — 23.00*

Даты | Падзеі | Людзі

### 1 ЛІПЕНЯ

**1569** год. У польскім Любліне агульны сойм ВКЛ і Кароны Польскай пастанавіў зацвердзіць акт Люблінскай уніі. У ім гаварылася, што «Каралеўства Польскае і Вялікае Княства Літоўскае ўяўляюць сабою ўжо адно непадзельнае і неаддзельнае цэлае, а таксама не асобную, а адну агульную рэспубліку, якая злучылася і злілася ў адзін народ з дзвюх дзяржаў і народаў». Такім чынам быў пакладзены пачатак магутнай еўрапейскай дзяржаве — Рэчы Паспалітай, якая праіснавала два стагоддзі. Але для ВКЛ гэта ў многім азначала страту самастойнасці і ўрэшце прывяло да заняпаду інстытутаў дзяржаўнай улады і апалячвання шляхты.

**1941** год. Бюро ЦК КП(б)Б прыняло дырэктыву «Аб разгортванні партызанскай вайны ў тыле ворага», у якой былі дадзены канкрэтныя ўказанні па формах арганізацыі, сродках сувязі і мер канспірацыі, стварэнні невыносных умоў для захопнікаў, зрыве ўсіх іх мерапрыемстваў.

**75** гадоў таму пачаў выходзіць агітплакат, орган ЦК КП(б)Б пад назвай «Раздавім фашысцкую гадзіну». У яго стварэнні прымалі ўдзел вядомыя беларускія пісьменнікі Янка Купала, Якуб Колас, Кузьма Чорны. Выданне засылалі ў тыл ворага, распаўсюджвалі на акупаванай тэрыторыі, яно сродкамі высмейвання і паэтычнага мастацтва заклікала людзей



на барацьбу з ворагам. Са жніўня 1945-га выдавецца ў Мінску як часопіс сатыры і гумару «Вожык». Сёння «Вожык» — адзін з часопісаў Выдавецкага дома «Звязда».

**Было сказана**

**Янка СІПАКОЎ, пісьменнік:**
*«Стварыць сабе куміра і пакланяцца яму — гэта значыць, разбурыць, бязлітасна знішчыць сябе як асобу».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2468.
Нумар падпісаны ў 19.30 30 чэрвеня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12